WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

23 ЧЭРВЕНЯ 2011 г. ЧАЦВЕР № 116 (26980)

Кошт 750 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Фота БЕЛТА.



## Аляксандр Лукашэнка наведаў заставу імя А.М. Кіжаватава

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка наведаў учора пагранічную заставу «Брэст» імя Героя Савецкага Саюза лейтэнанта А.М. Кіжаватава, якая ахоўвае ўчастак дзяржграніцы ў раёне горада Брэста з 1944 года, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Кіраўнік дзяржавы азнаёміўся з матэрыяльнай базай пагранзаставы і бытам пагранічнікаў, ходам і асаблівасцямі баявой падрыхтоўкі. Аляксандр Лукашэнка, які ў свой час адслужыў тэрміновую службу на граніцы ў гэтых мясцінах, сустрэўся з асабовым складам пагранзаставы, азнаёміўся з перспектывамі развіцця і матэрыяльна-тэхнічнага аснашчэння Брэсцкай пагрангрупы.

Прэзідэнт агледзеў музей пагранзаставы, кантрольна-следавую паласу. Увазе кіраўніка дзяржавы быў прадстаўлены шэраг тэхнічных навінак, якія выкарыстоўваюць пагранічнікі ў сваёй службовай дзейнасці. Сярод іх — верталёт вытворчасці кампаніі «Еўракоптар». Чатыры такія вінтакрылыя машыны нядаўна былі закуплены для органаў пагранслужбы Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка таксама паглядзеў паказальныя выступленні кінолагаў, дзеянні пагранічнікаў па затрыманні ўмоўных парушальнікаў.

Па выніках аператыўна-службовай дзейнасці ў 2010 годзе застава з'яўляецца лепшым падраздзяленнем сярод пагранзастаў органаў пагранічнай службы Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел у мерапрыемствах, прысвечаных 70-годдзю пачатку Вялікай Айчыннай вайны, якія прайшлі ў мемарыяльным комплексе «Брэсцкая крэпасць-герой». Кіраўнік дзяржавы ўсклаў вянок да скульптурнай кампазіцыі «Героям граніцы, жанчынам і дзецям, якія мужнасцю сваёй у неўміручасць крочылі». Аляксандр Лукашэнка таксама ўручыў баявыя сцягі воінскім часцям органаў пагранічнай службы і наведаў Свята-Мікалаеўскі гарнізонны сабор.

Уладзімір МАКЕЙ:

## «БЯГУЧАЯ СІТУАЦЫЯ Ў ЭКАНОМІЦЫ БЕЛАРУСІ ПАТРАБУЕ АД НАЦБАНКА І КАМЕРЦЫЙНЫХ БАНКАЎ УЗГОДНЕНЫХ ДЗЕЯННЯЎ»

**Аб гэтым заявіў учора кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Уладзімір Макей, прадстаўляючы калектыву Нацыянальнага банка выконваючага абавязкі старшыні праўлення Нацбанка Юрыя Алымава, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Пералічваючы задачы, якія стаяць сёння перад Нацыянальным банкам, Уладзімір Макей звярнуў увагу на важнасць забеспячэння дакладнага выканання Нацбанкам ролі галоўнага рэгулятара грашова-крэдытных адносін. «А гэта не што іншае, як абарона і забеспячэнне ўстойлівасці беларускага рубля, у тым ліку яго пакупной здольнасці і курсу адносна замежных валют», — адзначыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. У ліку прыярытэтных задач ён таксама назваў развіццё і ўмацаванне банкаўскай сістэмы Беларусі, забеспячэнне эфектыўнага, надзейнага і бяспечнага функцыянавання плацежнай сістэмы.

«Бягучая сітуацыя патрабуе ад Нацыянальнага банка і ад усіх камерцыйных банкаў, на гэта хацелася б звярнуць асаблівую ўвагу, узгодненых і падпарадкаваных адзінай задуме дзеянняў, — падкрэсліў Уладзімір Макей. — Адначасова з гэтым вельмі важная і аглядная функцыя Нацбанка, паколькі акуратная і эканамічна выверaная палітыка камерцыйных банкаў — гэта не толькі пытанне ўстойлівага функцыянавання канкрэтнага банка, але і залог здароўя ўсёй эканомікі краіны».

Выключную важнасць набывае таксама рэалізацыя такіх функцый Нацбанка, як валютнае рэгуляванне і валютны кантроль. Уладзімір Макей адзначыў, што кіраўнік дзяржавы неаднаразова падкрэсліваў неабходнасць прыняцця Нацыянальным банкам і ўрадам узгодненых, дакладна вывераных дзеянняў па стабілізацыі сітуацыі на ўнутраным валютным рынку краіны, перасцерагаючы і Нацбанк, і ўрад ад прыняцця рэзкіх, паспешных рашэнняў у гэтай сферы. «Сёння жыццёва важна выбраць такую траекторыю, якая дасць магчымасць нам захаваць суверэнітэт пры гарантаваным паступовым нарошчванні міжнародных рэзервовых актываў, — дадаў ён. — Але рухацца трэба асцярожна, узважана, пралічваючы кожны крок, каб ні ў якім разе не наламаць дроў».

СТАР. 2

## «ПАТРЭБНА КРОЧЫЦЬ У НАГУ З ЧАСАМ І БЫЦЬ АДКАЗНЫМ ЗА КОЖНАЕ СЛОВА»

**УДЗЕЛЬНІКІ Беларускага міжнароднага медыяфорума «Партнёрства ў імя будучыні: патрыятызм, духоўнасць, яднанне» ўсклалі ўчора кветкі да абеліска Перамогі ў Мінску, а таксама наведалі «Лінію Сталіна».**

— Самае галоўнае, што медыяфорум дае ўнікальную магчымасць прафесіяналам адчуць сваю адказнасць у прафесіі, адказнасць за будучыню і сучаснасць свайго народа і народаў-суседзяў. Беларусь адкрыта для свету, і мы рады вітаць журналістаў з 21 краіны, — сказала журналістам **Лілія АНАНІЧ, першы намеснік міністра інфармацыі**. — Разам з тым, мы сёння кажам пра тое, што ў журналістаў высокая місія — зберагаць і захоўваць гісторыю, свята шанаваць подзвіг нашых бацькоў і дзядоў. Таму мы невыпадкова наш медыяфорум пачынаем з ускладання вянкоў і кветак да абеліска Перамогі — гэта святое месца для кожнага беларуса, для кожнага госця нашай краіны. 24 чэрвеня адбудзецца пленарнае пасяджэнне, якое пройдзе ў канферэнц-зале Нацыянальнай бібліятэкі — гэта вельмі вялікая «мазгавая атака» па самых актуальных тэмах развіцця грамадства і дзяржавы. Мы будзем казаць пра тое, што ў рамках 20-годдзя СНД у кожнай краіны ёсць свой унікальны вопыт, і нам, журналістам, важна гэты вопыт аналізаваць, ацэньваць і бачыць, як развіваюцца краіны ўжо на постсавецкай прасторы.

СТАР. 2



Фота БЕЛТА.

| Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.06.2011 г. (для б/н разлікаў) | | Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ |
|---|---|---|
| ▼ 1 долар ЗША ... 4 958,00 | 1 чэшская крона ... 294,53 | USD ... 27,8960 |
| ▲ 1 еўра ... 7 142,00 | 1 польскі злоты ... 1 791,83 | 10 UAH ... 35,0257 |
| 1 латвійскі лат ... 10 065,98 | ▲ 1 расійскі рубель ... 177,73 | 10000 BYR ... 56,1175 |
| 1 літоўскі літ ... 2 067,90 | 1 украінская грыўня ... 620,02 | EUR ... 40,1814 |

ISSN 1990 - 763X

### Трактар упаў у раку. Трактарыст не выплыў

Трактарыст Пружанскага ПМС каля в. Лінова абкошваў бераг р. Мухавец. Трактар перакуліўся і ўпаў у раку. Трактарыст загінуў.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

Кропка на планеце




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жлобінскі раён.

## Свяча Любові і Выратавання

**СТАРЭЙШАЯ жыхарка вёскі Любоў (адзінай вёскі ў Беларусі з гэткай назвай) Тамара Лёгенькая — адна з апошніх сведак трагедыі, якая магла аднойчы сцерці Любоў з твару зямлі. У час вайны фашысцкія карнікі загналі жыхароў у склеп, каб спаліць — адпомсціць за сувязь з партызанамі. Адбыўся цуд: і вёска ацалела, і людзі не загінулі. Як і чаму? Вось што прыгадвае 86-гадовая Тамара Арцёмаўна Лёгенькая:**

«Калі мы сядзелі ў склепе і разумелі, што нам жывымі ўжо не выйсці, адна з жанчын прапанавала маліцца і пакляласся, што, калі ацалеем, будзем тройчы на год насіць свячу і славіць Бога. Усе пакляліся. І нас не спалілі».

І хоць вайна не пакінула Любоў без ахвяр (частка хат усё ж згарэла), жыхары дагэтуль вераць у цуд Божай дапамогі. А пасля вайны сапраўды сталі тройчы на год пераносіць свячу з хаты ў хату.

— Пасля вайны мы жылі ў вёсцы дружна, як адна сям'я. Ніхто ніколі не разводзіўся, як цяпер, — кажа захавальніца любовіцкай свячы.— Не біліся, не сварыліся.

Баба Тамара выгадавала чацвёра дзяцей, дачакалася 8 унукаў і 8 праўнукаў. Пяцігадовая Паліна (на фотаздымку) — самая маленькая з нашчадкаў.

— Гэта дзякуючы свячы ў мяне такая добрая праўнучачка, — з пяшчотаю кажа Тамара Лёгенькая. — Таму і вырашыла назаўсёды пакінуць сабе свячу Любові, бо ўжо некалькі гадоў мы яе не пераносім.

## ЗЯМЛІ «НА ХАЛЯВУ» НЕ БУДЗЕ?

**ГЕНЕРАЛЬНАЯ пракуратура прапануе рэфармаваць зямельнае заканадаўства. Ініцыятывы ў гэтай сферы выкліканы ў асноўным павелічэннем фактаў незаконнага выдзялення зямельных участкаў у Мінскім раёне.**

— Жыхары Мінска — падкрэслю, дастаткова паспяховыя, — адзначыў **начальнік упраўлення па наглядзе за выкананнем заканадаўства і законнасці прававых актаў Генпракуратуры Павел РАДЗІВОНАЎ**, — у масавым парадку рэгістраваліся на тэрыторыі Мінскага раёна. Тым самым незаконна набывалі статус грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, і ўжо праз 2-3 тыдні атрымлівалі зямельны ўчастак абсалютна бясплатна.

Аб маштабах падобных злоўжыванняў яскрава сведчыць статыстыка. Так, калі ў 2008 годзе ў Мінскім раёне было выдзелена 200 зямельных участкаў, то ў 2009 — 4300. У некаторых сельсаветах падобная дзейнасць прыняла сістэматычны і арганізаваны характар. Так, у адным з інтэрнатаў Мінскага раёна фіктыўна было зарэгістравана больш як 400 чалавек, якія там ніколі не пражывалі.

— Усё гэта рабілася з адной мэтай — бясплатна атрымаць зямельны ўчастак і льготны крэдыт, — адзначыў прадстаўнік Генпракуратуры. — Па гэтым факце незаконнай рэгістрацыі грамадзян хутчэй за ўсё будзе заведзена крымінальная справа. Дарэчы, крымінальная справа за аналагічнае злачынства ўжо распачата ў адносінах прадпрымальніка. Апошні незаконна рэгістраваў людзей у Мінскім раёне. «Кліентамі» яго сталі больш чым 4 тысячы чалавек.

Паводле слоў Паўла Радзівонава, тыя людзі, якія незаконна атрымалі зямельныя ўчасткі, у хуткім часе перапрадавалі іх па рынкавым кошце (толькі кадастравы кошт 15 сотак зямлі ў такім папулярным месцы, як тэрыторыя Бараўлянскага сельсавета, складае $30 тыс.).

Нярэдка падобныя парушэнні дапускаліся з маўклівай згоды мясцовых улад. У сувязі з гэтым Генпракуратура ўнесла прадстаўленні кіраўніцтву Мінскага раёна і Мінскай вобласці з патрабаваннем навесці парадак у гэтай сферы і прыцягнуць да адказнасці асоб, якія дапусцілі такую сітуацыю.

— Таксама мы прапануем дазволіць грамадзянам, якія незаконна атрымалі зямлю, пакідаць яе ў сваім карыстанні, — адзначыў Павел Радзівонаў. — Але толькі пры ўмове выплаты дзяржаве кратнага, адносна кадастравага, кошту выдзеленага зямельнага ўчастка. Памер кратнасці пакуль не вызначаны. Гэта пытанне зараз абмяркоўваецца.

Абмяркоўваецца таксама і прапанова аб увядзенні абмежавання на продаж зямельных участкаў (атрыманых тымі, хто меў патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў) на працягу пяці гадоў з моманту рэгістрацыі правоў на зямлю.

— Яшчэ, на наш погляд, неабходна абмежаваць рэгіёны, у якіх могуць бясплатна прадастаўляцца зямельныя ўчасткі. Кошт зямельнага ўчастка ў Бараўлянскім і Ждановіцкім сельсаветах, напрыклад, вымяраецца дзясяткамі тысяч долараў. Грошы, атрыманыя ад рэалізацыі гэтай зямлі на аўкцыёне, дзяржава магла б накіраваць на сацыяльныя праекты, абсталяванне інфраструктуры, рэальную дапамогу, у тым ліку тым, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

Таксама існуе праблема нямэтавага выкарыстання зямлі. На ўчастках, якія выдзяляюцца грамадзянам для вядзення асабістай прысядзібнай гаспадаркі, часам будуюцца станцыі тэхабслугоўвання ці офісы. У некаторых выпадках гэта звязана яшчэ і з незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасцю.

Павел Радзівонаў лічыць, што ў такіх сітуацыях штраф у памеры 10 базавых велічынь — не надта эфектыўная мера ў параўнанні з канфіскацыяй зямлі. У шэрагу выпадкаў пытанне будзе ставіцца менавіта так. З некаторых гаспадароў такіх участкаў, магчыма, будзе спаганяцца на карысць дзяржавы і ўрон за ўхіленне ад выплаты зямельнага падатку.

— Я перакананы, што меры, якія ініцыюе Генпракуратура, — рэзюмаваў суразмоўца, — у перспектыве дазволяць знізіць рынкавы кошт зямельных участкаў на аўкцыёне.

**Надзея ДРЫЛА.**

### СЯРОД ЗАГІНУЛЫХ ЧЛЕНАЎ ЭКІПАЖА ПРЫ КАТАСТРОФЕ ТУ-134 ПАД ПЕТРАЗАВОДСКАМ БЫЎ ГРАМАДЗЯНІН БЕЛАРУСІ

Сярод загінулых пры катастрофе Ту-134 пад Петразаводскам быў грамадзянін Беларусі Міхаіл Карпук. Аб гэтым **БЕЛТА** паведаміў начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар МЗС Беларусі Андрэй Савіных. Загінулы быў членам экіпажа авіялайнера. Авіякампанія «РусЭйр» ужо паведаміла сваякам аб гэтай трагедыі і забяспечыць іх прыезд у Петразаводск. Акрамя таго, блізкім Карпука будзе аказана неабходнае консульскае садзейнічанне з боку беларускіх дыпламатаў.

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ

WWW.RLT.BY

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ЗАО «АХЕКА» (продавец)**

проводит открытый аукцион по продаже объектов недвижимого имущества, расположенного по адресу: **Минская обл., Логойский р-н, Швабский с/с, район д. Мостище,** в составе:

**Лот № 1:** здание коровника (инв. № 601/С-19191), об. пл. 1247.2 кв.м. Начальная цена с НДС – 101 311 676 бел. руб. Площадь земельного участка – 1,8806 га.

**Лот № 2:** здание кузницы (инв. № 601/С-19189), об. пл. 133.4 кв.м. Начальная цена с НДС – 21 317 353 бел. руб. Площадь земельного участка – 0,3355 га.

**Лот № 3:** здание телятника (инв. № 601/С-19192), об. пл. 862.5 кв.м. Начальная цена с НДС – 91 362 980 бел. руб. Площадь земельного участка – 2,3150 га.

**Лот № 4:** здание для запчастей (инв. № 601/С-19190), об. пл. 131.9 кв.м. Начальная цена с НДС – 29 464 721 бел. руб. Площадь земельного участка – 0,3178 га.

**Лот № 5**: здание зерносклада (инв. № 601/С-19188), об. пл. 318.4 кв.м. Начальная цена с НДС – 53 065 248 бел. руб. Площадь земельного участка – 0,9230 га.

Объекты расположены в водоохранной зоне реки Цна.

**Задаток 10% от начальной цены объекта (лота) перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Банк» г. Минск, БИК 153001369, УНП 690324015, Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

**Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.**

Аукцион состоится **27.07.2011** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **26.07.2011** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.**

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ

WWW.RLT.BY

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Автомагистраль» (продавец)**

проводит повторный открытый аукцион по продаже незавершенного строительством законсервированного здания склада ПСС и соли **(арочник)** (готовность 70%, инв. № 630/U-62514), об. пл. **907,9 кв.м**, расположенного по адресу: Минская область, Молодечненский район, **г. Молодечно, ул. Вередовская, д. 6 б**.

**Начальная цена с НДС (снижена на 50%) – 252 034 200 бел. руб.**

**Площадь земельного участка – 0,3400 га.**

**Задаток в сумме 50 000 000 бел. руб. перечисляется на р/с 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Банк» БИК 153001369 г. Минск, УНП 690324015, Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 10.03.2011, предыдущее извещение в газете «Звязда» от 06.05.2011.

Аукцион состоится **30.06.2011** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **29.06.2011** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.**

Інстытут «Барысаўпраект»

## У канкурэнтнай барацьбе самы галоўны аргумент — ЯКАСНЫ ПРАДУКТ

**Прыгожыя сучасныя забудоўлі ў жылых кварталах новых мікрараёнаў, іншыя адметныя аб'екты, з якімі нас нядаўна пазнаёмілі, з'явіліся апошнім часам у гарадах Барысаве і Жодзіне, працягваюць узводзіцца тут цяпер. А спраектаваны яны спецыялістамі інстытута «Барысаўпраект». Зрэшты, у інстытуце ўдакладняюць: яго праектная дзейнасць распаўсюджваецца на ўсю Мінскую вобласць; у прыватнасці, тут праектавалі жыллё і для Смалявічаў, Салігорска, Дзяржынска, Узды, Крупак, для іншых населеных пунктаў, распрацоўвалі генеральны план развіцця гарадскога пасёлка Мачулішчы.**

Аднак да дзейнасці інстытута ў гэтым напрамку мы яшчэ звернемся. А напачатку прадставім аб'ект, які, як зазначаюць у Барысаве, павінен стаць прэстыжным не толькі для горада, але і ўвогуле для краіны, аб'ект еўрапейскага ўзроўню, і больш канкрэтна — годны футбольнай каманды БАТЭ. Ужо, напэўна, зразумела: размова ідзе пра ўзвядзенне ў Барысаве сучаснага стадыёна.

Пэўныя абрысы гэтага стадыёна, «на натуры», яшчэ нялёгка ўявіць. Хіба што можна скласці пэўнае меркаванне па эскізным макеце, які нам паказалі. Вельмі прыгожа, і асабліва ўражвае свайго роду купал над чашай стадыёна: ні даць ні ўзяць — завіслая над ім касмічная талерка. Адкуль такая задумка? Інстытут «Барысаўпраект» з'яўляецца генеральным праектантам. Архітэктурную ж частку праекта выканала архітэктурная група са Славеніі, якая ўжо зарэкамендавала сябе падобнымі праектамі ў іншых краінах. Да выканання барысаўскага праекта таксама прыцягнута і літоўская фірма «Магнус Груп» (рэзідэнт Беларусі). Такім чынам, як падкрэсліваюць у інстытуце, праект гэты — інтэрнацыянальны.

Згодна з праектам, на новым стадыёне для БАТЭ будуць абсталяваны сучасныя трыбуны на 13 тысяч гледачоў, тут прадугледжаны (на падтрыбуннай прасторы) уся неабходная інфраструктура, якую павінны мець спартыўныя аб'екты, а таксама забаўляльныя цэнтры, гандлёвыя павільёны.

Новы стадыён узводзіцца (дакладней — тут цяпер пакуль што поўным ходам ідуць земляныя работы) на ўскраіне Барысава, на выездзе з яго ў мінскім напрамку. Агульная плошча аб'екта — 12 гектараў, кошт — каля 100 мільярдаў рублёў. Фінансуецца ён часткова за сродкі абласнога ўпраўлення капітальнага будаўніцтва, часткова — еўрапейскай футбольнай арганізацыяй УЕФА, а таксама за сродкі непасрэдна самога прадпрыемства БАТЭ. Увод аб'екта — у снежні 2012 года. Узвядзенне гэтага стадыёна адобрыў прэзідэнт краіны.

Можна меркаваць, «спартыўная» тэматыка стала ў дзейнасці інстытута «Барысаўпраект» адной з асноўных. На яго рахунку таксама праект дзейнага на цяперашні час стадыёна БАТЭ (тут па адпаведным праекце рэканструкцыі пашырана яго ўмяшчальнасць, узведзена новая трыбуна з прыгожым казырком); па праекце інстытута рэканструюецца стадыён «Тарпеда» ў Жодзіне. Прычым у Жодзіне праектантамі інстытута выдадзена цікавае рашэнне па ўзвядзенні казырка над трыбунамі. З тым, каб не ўскладняць усю канструкцыю трыбун, не ставіць сярод іх жалезабетонныя апоры, праектанты прапанавалі ўстанавіць ззаду трыбун кансольныя фундаменты з буранабіўных, бураін'екцыйных паляў, на якіх і павінен «павіснуць» той жа «казырок». «Лёгкі» і «паветраны». Як падкрэслівае намеснік галоўнага інжынера інстытута Мікалай Гламбоцкі, гэта будзе сучасная трыбуна, а ў цэлым разам з выкананнем іншых праектных прапаноў стадыён будзе адпавядаць усім патрабаванням УЕФА. Яшчэ адзін з апошніх аб'ектаў спартыўнага кірунку, над якім спачатку папрацавалі праектанты з інстытута «Барысаўпраект», — рэканструяваны былы «даўгабуд» фізкультурна-аздараўленчага цэнтра, што раней належаў барысаўскаму заводу «Аўтагідраўзмацняльнік». Ужо праз які месяц ён будзе ўведзены ў строй, а ў выніку барысаўчане атрымаюць выдатны падарунак. За гэтым аб'ектам застаецца яго ранейшае ж прызначэнне, адпаведна — тут абсталяваны басейны, а таксама спартыўныя і трэнажорныя залы.

СТАР. 6







**• Комплекс жылых будынкаў па распрацоўках КУП «Інстытут «Барысаўпраект» вырас у новым мікрараёне Барысава.**

**• Помнік князю Барысу — візітоўка сучаснага Барысава. Навакольную тэрыторыю добраўпарадкавалі і аформілі па праекце інстытута.**

**• Спецыялісты КУП «Інстытут «Барысаўпраект» заўседы гатовы выдаць неабходнае праектнае рашэнне.**

## У Беларусі ствараецца Банк развіцця для крэдытавання ўключаных у дзяржпраграмы праектаў

**Адпаведны ўказ № 261 «Аб стварэнні адкрытага акцыянернага таварыства «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь» 21 чэрвеня падпісаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.**

Дакументам прадугледжваецца змяненне сістэмы фінансавання дзяржаўных праграм, зацверджаных Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь або ўрадам. Цяпер фінансаванне дзяржаўных праграм ажыццяўляецца ў асноўным дзяржаўнымі банкамі — ААТ «ААБ Беларусбанк» і ААТ «Белаграпрамбанк». Прыярытэтнай мэтай стварэння і дзейнасці Банка развіцця з'яўляецца крэдытаванне праектаў, уключаных у дзяржаўныя праграмы, і іх суправаджэнне. Крэдытаванне такіх праектаў будзе ажыццяўляцца Банкам развіцця ў парадку, вызначаным урадам. Пры гэтым ствараемая структура не будзе абслугоўваць фізічных асоб. Стварэнне Банка развіцця і ўвядзенне механізма спецыяльнага інвеставання дадуць магчымасць павысіць эфектыўнасць выканання праектаў, уключаных у дзяржаўныя праграмы, скараціць тэрміны іх рэалізацыі і акупнасці затрат.

## Камерцыйным банкам прапанавана ў 2011—2015 гадах прыняць удзел у льготным крэдытаванні арганізацый АПК

**Адпаведны ўказ № 256 «Аб дадатковых мерах па рэалізацыі дзяржаўных праграм у галіне сельскай гаспадаркі» кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў 20 чэрвеня.**

«Указам прапануецца банкам выдаваць у 2011—2015 гадах ільготныя крэдыты ў беларускіх рублях арганізацыям аграпрамысловага комплексу для будаўніцтва, рэканструкцыі, капітальнага рамонту, мадэрнізацыі і тэхнічнага пераасначшэння вытворчых аб'ектаў, прадугледжаных асобнымі праграмамі ў галіне сельскай гаспадаркі», — праінфармавалі ў прэс-службе Прэзідэнта. Ва ўказе не вызначаны канкрэтныя банкі і сумы выдаваемых імі крэдытаў. Такі падыход дае магчымасць любому камерцыйнаму банку, які мае дастатковую ліквіднасць, удзельнічаць у крэдытаванні праграм. Сумы крэдытаў будуць вызначацца банкамі пасля прапрацоўкі адпаведных бізнэс-планаў арганізацый. Прыняцце ўказа накіравана на павышэнне стабільнасці і ўстойлівасці сельскагаспадарчай вытворчасці, а таксама на стварэнне спрыяльных умоў для прыцягнення камерцыйных банкаў да ўдзелу ў крэдытаванні праграм, што рэалізуюцца ў аграпрамысловым комплексе.

## У Беларусі будзе створана Адзіная сістэма навігацыйна-часавага забеспячэння

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 21 чэрвеня падпісаў Указ № 260 «Аб навігацыйнай дзейнасці», якім устаноўлены прававыя адносіны паміж органамі дзяржаўнага кіравання, распрацоўшчыкамі, вытворцамі і карыстальнікамі навігацыйных рэсурсаў, а таксама рэгламентаваны пастаянны кантроль дзяржавы за дзейнасцю па вытворчасці, эксплуатацыі і мадэрнізацыі навігацыйных сістэм.**

Дзяржаўным ваенна-прамысловым камітэтам будзе арганізавана дзяржаўная рэгістрацыя навігацыйных сістэм — элементаў Адзінай сістэмы навігацыйна-часавага забеспячэння; забяспечана распрацоўка дзяржаўных мэтавых і навукова-тэхнічных праграм у сферы навігацыйнай дзейнасці, арганізацыі правядзення навукова-даследчых і доследна-канструктарскіх работ у названай сферы; створаны ўмовы для прыцягнення айчынных і замежных інвестыцый, удасканалення механізма распрацовак і рэалізацыі праектаў у сферы навігацыйнай дзейнасці.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## «ПАТРЭБНА КРОЧЫЦЬ У НАГУ З ЧАСАМ...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Мяркую, што вельмі да месца будзе пагаварыць пра новую ролю СМІ, бо ў час новых інфармацыйных тэхналогій патрэбна крочыць у нагу з часам, і, разам з тым, разумець, што вельмі адказным павінна быць кожнае слова, якое выходзіць да гледача, слухача і чытача. Гістарычная праўда і гістарычная памяць — гэта тыя святыя каштоўнасці, якія нас сёння павінны аб'ядноўваць. Таксама нас сёння павінна яшчэ аб'ядноўваць і агульная будучыня, — сказала Лілія Ананіч.

Правядзенне медыяфорума лічыць важнай падзеяй і **Леанід РЭЧЫЦКІ, сакратар Саюза журналістаў Расіі**:

— Я люблю вашу рэспубліку, у 50-я гады я тут хлопчыкам праводзіў кожнае лета. Таму я пільна сачу за тым, што робіцца тут — за журналісцкімі поспехамі, за жыццём журналісцкай супольнасці Беларусі. Ну, і ў цэлым магу сказаць, што такі форум вельмі важны. Кола праблем, якое намечана ўзняць, вельмі шырокае. Для моладзі, для маладых кадраў, я лічу, гэта будзе добрая школа.

Сваім меркаваннем пра журналістыку і ролю журналістаў у грамадстве падзяліўся таксама **Уладзімір ГУБАРАЎ, пісьменнік, навуковы журналіст**:

— Медыяфорум — гэта добрая рэч, бо тут шмат цудоўных людзей, якія разбіраюцца ў журналістыцы і прапагандзе. Дарэчы, я нарадзіўся ў Магілёве, шмат маіх родных па лініі маці жывуць у Магілёўскай вобласці. І я з задавальненнем прыязджаю ў Беларусь, — сказаў ён. — Сустракацца вельмі важна. Але самае галоўнае — трэба вучыцца. Што мяне ўражвае ў сучаснай журналістыцы, як і ў грамадстве, што пачынае панаваць некультурнасць і ў грамадстве, і ў журналістыцы: на жаль, падае ўзровень журналістыкі. Бо нехта лічыць, што журналісты — гэта абслуговая публіка, якая павінна абслугоўваць гламур і астатняе глупства. А журналістыка павінна даваць людзям уяўленне пра тое, як ім жыць. Для гэтага журналісты павінны быць вельмі адукаванымі. І ў наш час так і было, — перакананы Уладзімір Губараў, пры гэтым ён лічыць, што так званы «гламур» навязваецца грамадству: — Не, людзі самі «гламур» не патрабуюць — яго ім навязваюць. Людзі наогул заўсёды імкнуліся да ведаў, да пазнання самага цікавага. Гэта навязванне меркавання невялічкай групы людзей, якім патрэбна, каб вакол было як мага больш «тупых» людзей. Бо калі вакол дурні, то вельмі зручна, а калі вакол разумныя, то гэта нашмат складаней, бо самому трэба быць разумным.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

## Імпарт расійскай электраэнергіі не спынены

**Расійская кампанія «Інтэр РАТ АЭС» не спыніла пастаўкі электраэнергіі ў Беларусь з 00.00 22 чэрвеня, паведаміла карэспандэнту БЕЛТА памочнік міністра энергетыкі Беларусі Людміла ЗЯНЬКОВІЧ.**

Раней кампанія «Інтэр РАТ АЭС» заяўляла аб такім намеры ў сувязі з нявыплатай беларускім бокам 20 чэрвеня другога траншу ў лік доўгу за электраэнергію. У адпаведнасці з дамоўленасцю паміж «Інтэр РАТ АЭС» і ДВА «Белэнерга» выплата гэтага траншу адтэрмінавана да 28 чэрвеня.

## ГУУС МІНГАРВЫКАНКАМА: ЗАКЛІКІ ДА ЎДЗЕЛУ Ў НЕСАНКЦЫЯНАВАНЫХ АКЦЫЯХ ПРАЗ САЦЫЯЛЬНЫЯ СЕТКІ ПЕРАРАСТАЮЦЬ У РЭАЛЬНАЕ ПАРУШЭННЕ ЗАКОНА

**Так званыя «рэвалюцыі праз сацыяльныя сеткі» з віртуальных груп у сацыяльных сетках перарастаюць у рэальнае парушэнне беларускага заканадаўства, заявілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-службе ГУУС Мінгарвыканкама.**

Як адзначаюць у ГУУС, гэта адбываецца з таго часу, калі заклікі, якія гучаць у віртуальным свеце, перамяшчаюцца ў рэальнасць. У міліцыі растлумачылі: «Арганізатары заклікаюць маўчаць або мыкаць, тупаць або пляскаць, але заканадаўству важны ў першую чаргу сам факт арганізацыі такіх мерапрыемстваў». Несанкцыянаваная акцыя застаецца незаконнай незалежна ад яе фармату. ГУУС папярэджвае грамадзян, што за проціпраўныя дзеянні заканадаўствам прадугледжана не толькі адміністрацыйная, але і крымінальная адказнасць.

## П'яны кіроўца на «Ягуары» разбіў шэсць машын

**У Мінску п'яны кіроўца на «Ягуары» пашкодзіў 6 аўтамабіляў, паваліў асвятляльную мачту і сам разам з трыма пасажырамі апынуўся ў бальніцы.**

«22 чэрвеня ў 3.30 ночы кіроўца 1989 г.н. на аўтамабілі «Ягуар XGR» рухаўся па вуліцы Радужнай з боку праспекта Пераможцаў. Побач з магазінам «Радзівілаўскі» на закругленні дарогі ён не справіўся з кіраваннем і ўехаў у асвятляльную мачту. Ад удару аўтамабіль вынесла на стаянку, дзе ён пашкодзіў «Фіят», які, у сваю чаргу, пратараніў «Пежо». Ад падзення асвятляльнай мачты разбіты яшчэ тры машыны», — расказала старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе АДАІ цэнтральнага РАУС Настасся Цыбіна. У «Ягуары» знаходзілася трое пасажыраў (дзве 19-гадовыя дзяўчыны і хлопец 1989 г.н.). Ні яны, ні кіроўца не былі прышпілены рамянямі бяспекі, і ў выніку ўсе з траўмамі дастаўлены ў бальніцу. У абодвух пасажыраў цяжкія чэрапна-мазгавыя траўмы. Яны былі змешчаны ў рэанімацыю. Падчас афармлення ДТЗ у кіроўцы былі ўсе прыкметы алкагольнага ап'янення.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

## П'яны бацька, п'яная маці... Што чакае траіх дзяцей?

**Суд Бярозаўскага раёна вынес пакаранне 43-гадоваму мужчыне. Яго прыгаварылі да 4 гадоў пазбаўлення волі з адбыццём пакарання ў папраўчай калоніі ўзмоцненага рэжыму.**

У гэтай трагедыі ёсць адзін нюанс, які прымушае глянуць на праблему больш шырока. Муж знаходзіўся на заробках у Брэсце і прыехаў праведаць жонку і дзяцей. Па дарозе моцна выпіў, і калі жонкі не аказалася дома, то пайшоў яе шукаць. Жонка была на 8-м месяцы цяжарнасці. Мужчына сустрэў жанчыну на вуліцы і пачаў яе біць рукамі ды нагамі. Абуты ён быў у кірзавыя чаравікі. Тыя пабоі прывялі да ўнутрывантробнай смерці дзіцяці. У гэты дзень, як паказалі сведкі, цяжарная піла гарэлку і была моцна нападпітку. Па заключэнні медэкспертызы ў крыві дзіцяці канцэнтрацыя алкаголю дасягнула 1,8 праміле. Застаецца толькі ўздыхнуць і дадаць, што ў сям'і яшчэ трое няпоўнагадовых дзяцей.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## «БЯГУЧАЯ СІТУАЦЫЯ Ў ЭКАНОМІЦЫ БЕЛАРУСІ ПАТРАБУЕ АД НАЦБАНКА І КАМЕРЦЫЙНЫХ БАНКАЎ УЗГОДНЕНЫХ ДЗЕЯННЯЎ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта падкрэсліў, што ў цяперашніх умовах галоўная задача — гэта захаванне рабочых месц на прадпрыемствах краіны. «Менавіта таму мы павінны не разбазарваць валюту, а накіроўваць на тыя праекты, якія дадуць максімальны эфект для краіны і ў канчатковым выніку для простага чалавека», — сказаў ён.

Уладзімір Макей адзначыў, што сітуацыя ў эканоміцы сапраўды няпростая. «Дарадчыкаў шмат, з усіх бакоў — ад рыначнага радыкалізму да ваеннага камунізму, але не трэба кідацца ў вір гэтых парад, забываючы аб асцярожнасці, — сказаў ён. — Неабходна ўсіх выслухоўваць, усе парады аналізаваць прымяняльна да нашых умоў, як справядліва патрабуе кіраўнік дзяржавы». Паводле слоў кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, сёння няма гатовых эканамічных рэцэптаў на нестандартныя выклікі, якія стаяць перад краінай. «Прынцып адзін: прымаючы сур'ёзнае макраэканамічнае рашэнне, мы павінны арыентавацца ў канчатковым выніку на тых, на каго накіравана гэта рашэнне — на канкрэтныя прадпрыемствы, канкрэтны працоўны калектыў, канкрэтнага простага чалавека, — падкрэсліў ён. — Менавіта такога падыходу патрабуе ад нас у цяперашніх умовах кіраўнік дзяржавы».

Гаворачы аб асабістых якасцях Юрыя Алымава, Уладзімір Макей адзначыў, што гэта высокакваліфікаваны спецыяліст, які ведае ўсе аспекты дзейнасці банкаўскай сістэмы краіны. У банкаўскай сферы ён працуе з 1985 года, у Нацбанку — каля 13 гадоў, з іх з 2001 года на пасадзе першага намесніка старшыні праўлення. «Яму даводзілася акрамя дзейнасці тут часта выязджаць і за межы краіны. І падзеі апошніх месяцаў паказалі, што яму пад сілу знаходзіць выйсце нават у самых няпростых сітуацыях, — сказаў ён. — Таму невыпадкова такое рашэнне Прэзідэнта ў гэты адказны для краіны час абавязкі кіраўніка Нацбанка ўскласці менавіта на яго».

«Юрый Міхайлавіч — чалавек для вас не новы, але яго сённяшні статус абавязвае быць патрабавальным і жорсткім кіраўніком, — заявіў Уладзімір Макей, звяртаючыся да калектыву Нацбанка. — Мы перакананы, што Юрый Міхайлавіч справіцца з пастаўленымі задачамі».

У сваю чаргу Юрый Алымаў падзякаваў за аказаны яму высокі давер. «Я зраблю ўсё магчымае, каб яго поўнасцю апраўдаць», — сказаў ён, пры гэтым дадаўшы, што сёння ў Нацыянальным банку прадаўжае працаваць вельмі дасведчаная каманда прафесіянальных кіраўнікоў і спецыялістаў, якая можа вырашаць самыя складаныя задачы. «Гэтыя задачы вызначаны. Іх вельмі дакладна паставіў перад намі ў ходзе нядаўніх выступленняў кіраўнік дзяржавы, — адзначыў Юрый Алымаў. — Перш за ўсё, гэта захаванне поўнай кіруемасці ў грашова-крэдытнай і банкаўскай сферы. Мы ні ў якім выпадку не дапусцім някіруемага развіцця сітуацыі ні на валютным рынку, ні на рынку дэпазітаў і крэдытаў, ні ў іншых галінах нашай адказнасці».

Паводле слоў Юрыя Алымава, Нацбанк павінен зрабіць усё магчымае для хутчэйшага вырашэння аднаго з самых важных пытанняў — нарошчвання дзяржаўных золатавалютных рэзерваў да ўзроўню, які надзейна забяспечыць эканамічную бяспеку дзяржавы. Стварэнне такіх рэзерваў дасць магчымасць не толькі поўнасцю нармалізаваць работу валютнага рынку, але і ўмацуе давер да нацыянальнай валюты і грашова-крэдытнай палітыкі. «Банкі забяспечаць неабходную крэдытную падтрымку эканомікі і прадоўжаць нарошчванне сваёй рэсурснай базы, — дадаў ён. — У аснове гэтага павінна быць прыцягненне зберажэнняў насельніцтва за кошт высокай даходнасці і абсалютнай надзейнасці ўкладаў у банках, уключаючы гарантаванасць іх вяртання па першым патрабаванні».

«Разам з урадам мы павінны вырашыць галоўнае сацыяльнае пытанне — забяспечыць абарону малазабяспечаных слаёў насельніцтва і аднавіць той узровень жыцця грамадзян, які склаўся да канца папярэдняй пяцігодкі, а затым прадоўжыць яго ўстойлівае павышэнне, — падкрэсліў Юрый Алымаў. — Мы добра разумеем, што гэтыя і іншыя задачы нам будзе вырашаць яшчэ складаней, чым у папярэдняй пяцігодцы. І не толькі з-за існуючай высокай нестабільнасці ў сусветнай эканоміцы і пастаяннага росту цэн на энерганосьбіты. Перш за ўсё, нам самім трэба будзе навучыцца вырашаць іх ва ўмовах жорсткай эканоміі і «жыцця па сродках», але я ўпэўнены, што мы з гэтым справімся».

## ПАМЕР ЗНЕШНЯЙ ПАЗЫКІ БЕЛАРУСІ НЕ ПЕРАСЯГНУЎ ДАПУШЧАЛЬНЫ ЎЗРОВЕНЬ У 25 АДСОТКАЎ ДА ВУП

**ПЕРШ чым разглядаць бюджэт на новы фінансавы год, беларускія парламентарыі па традыцыі зацвярджаюць справаздачу аб выкананні мінулага. Дакумент ужо паступіў у парламент. На пашыраным пасяджэнні профільнай камісіі законапраект прэзентаваў першы намеснік міністра фінансаў Уладзімір АМАРЫН.**

Летась казна атрымала каля 30,3 трлн рублёў (пераважна за кошт падаткаў — на прыбытак, на дабаўленую вартасць і г.д.) і выдаткавала прыблізна 34,3 трлн рублёў. Дэфіцыт склаў прыкладна 4 трлн рублёў (а гэта 2,5 адсотка да ВУП).

Летась фінансісты з помпай абвяшчалі зніжэнне падатковай нагрузкі на прадпрыемствы і абяцалі, што зробленыя імі захады пакінуць у распараджэнні прадпрымальнікаў 800 млрд рублёў. Дэпутаты турбаваліся, ці не пашкодзіла гэтаму павелічэнне ПДВ (з 18 да 20 адсоткаў) — ці сапраўды засталіся ў прадпрыемстваў вольныя сродкі, якія маглі быць пушчаны на развіццё.

Рэальна 800 млрд рублёў у распараджэнні прадпрыемстваў засталося, супакойвае народных абраннікаў першы намеснік міністра. Ён запэўнівае, што згаданыя захады «зрабілі карысць для прадпрыемстваў». А рэлізаваныя змены ў падатковай палітыцы адпавядаюць сістэме, якая існуе ў развітых краінах.

Крытыкавалі дэпутаты і «рэкамендацыі», якія дае фінансавае ведамства адносна распараджэння сродкамі на месцах (усім жа зразумела, што рэкамендацыі гэтыя будуць выкананы). Абураліся, у прыватнасці, скарачэннем сродкаў на капрамонт сацыяльных аб'ектаў. Маўляў, няўжо Мінфіну лепш бачна, чым выканкаму, куды падзець гэтыя сродкі? Уладзімір Амарын патлумачыў такія захады змушанасцю скарачаць выдаткі і абіраць з двух зол меншае. **Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце, фінансах і падатковай палітыцы Аляксандр АНТОНЕНКА** ў сваю чаргу нагадаў пра закон аб мясцовым самакіраванні (які дае большую свабоду распараджацца сродкамі на месцах. — **Аўт.**). Тым часам як «Мінфін часта ўмешваецца сваімі рэкамендацыямі і папраўкамі», абмяжоўваючы выкарыстанне мясцовых даходаў. Атрымліваецца, што «гэтымі падзаконнымі актамі адмяняецца дзеянне асобных палажэнняў закона», аналізуе дэпутат. «Мы як заканадаўцы павінны неяк рэагаваць на гэтыя пытанні».

Парламентарыі цікавіліся таксама, ці спраўдзіліся чаканні ад Мытнага саюза.

— Чаканні і ў плане фінансавых паказчыкаў, і ў плане эканамічнага ўзаемадзеяння збыліся, — запэўніў Уладзімір Амарын і дадаў, што цяпер чакаюць увядзення ў дзеянне АЭП.

Журналістам першы намеснік міністра фінансаў пракаментаваў надзённае. Ён засведчыў, што знешняя пазыка краіны, нават з улікам нядаўна атрыманых сродкаў з фонду ЕўрАзЭС, знаходзіцца на бяспечным узроўні — у межах 25 адсоткаў да ВУП. На бягучую пяцігодку гранічны ўзровень бяспекі для дзяржпазыкі павялічаны да 45 адсоткаў да ВУП. Пры гэтым унутраная пазыка павінна знаходзіцца ў межах 20, а знешняя — 25 адсоткаў. Неабходнасць такіх захадаў, паводле тлумачэнняў спадара Амарына, выклікана актыўнымі знешнімі запазычваннямі.

Унутраная дзяржаўная пазыка сёлета на 1 студзеня складала каля 32 трлн рублёў. Неўзабаве змянілася сама сістэма яе ўліку: адтуль, паводле міжнародных фінансавых стандартаў, былі выключаны гарантыі мясцовых улад і ўрада. Адпаведна, да сярэдзіны года памер унутранай дзяржаўнай пазыкі істотна зменшыўся, склаўшы прыблізна пяць трлн рублёў.

У 2011—2013 гадах штогадовы дэфіцыт айчыннага бюджэту не павінен перавышаць 1,5 адсотка да ВУП. Такая ўмова, як распавёў спадар Амарын, узгоднена з Антыкрызісным фондам ЕўрАзЭС. Адкуль, нагадаем, днямі паступіў у нашу краіну першы крэдытны транш у памеры 800 млн долараў, астатнія ж часткі будуць пералічвацца на працягу якраз 2011 — 203 гадоў.

Першы намеснік міністра паведаміў таксама, што Беларусь не плануе выпуск аблігацый і еўрабондаў да канца года. Ён нагадаў, што сёлета такім чынам ужо было прыцягнута 800 млн долараў з запланаванага мільярда. Яшчэ прыцягваць пакуль не плануем, кажа У. Амарын. Планаў няма і наконт расійскага рынку, дзе зараз размяшчаць аблігацыі, як выказаўся першы намеснік міністра фінансаў, няма сэнсу, бо сітуацыя гэтаму не садзейнічае.

**Зоя ВАРАНЦОВА.**

### Ну і ну!

#### «ЗАМОЧВАЙ» МАШЫНУ З РОЗУМАМ!

Малады жыхар Жабінкі мачыў машыну ў прамым і пераносным сэнсе. Цудам жывы застаўся. Гараджанін нядаўна прыгнаў аўто з-за мяжы. З радасці, відаць, што паспеў гэта зрабіць да ліпеня, добра выпіў. Прычым з самага ранку 22 чэрвеня. А тады сеў за руль і націснуў на газ. Справа была на вуліцы Набярэжнай, якая таму і завецца так, што праходзіць па беразе Мухаўца. Вокам не паспеў міргнуць, як на ўсёй хуткасці ўляцеў у раку. Глыбіня аказалася значнай: два метры вады было над машынай. Гараскадзёр неяк вылез з машыны сам. А вось транспартны сродак цягнулі з вады спецыялісты МНС.

**Яна СВЕТАВА.**

#### НА РАЦЭ СТЫР КРАЛІ РЫБУ

У Пінскім раёне затрыманы браканьеры, якія незаконна здабывалі рыбу на рацэ Стыр. Трое жыхароў Мінска, усе працаўнікі сталічных прадпрыемстваў, лавілі рыбу сеткамі ля вёскі Лапаціна. Канфіскаваны рыба і браканьерскія снасці. Урон, нанесены прыродзе, ацэньваецца прыкладна ў паўтара мільёна рублёў.

**Яна СВЕТАВА.**

#### ВУЧНІ АБРАБАВАЛІ ВУЛІЧНЫ ХАЛАДЗІЛЬНІК

У Віцебску жанчына, індывідуальны прадпрымальнік, паведаміла ў міліцыю аб крадзяжы з халадзільніка, які стаіць на вуліцы ля гандлёвага пункта, безалкагольных напояў на агульную суму звыш 380 тысяч рублёў. Ноччу зладзеі ўзламалі дзвярныя запоры і «пажывіліся».

Ва ўчыненні крадзяжу падазраюць вучня 11 класа, які знаходзіцца на ўліку ў інспекцыі па справах няпоўнагадовых, і яго таварыша — вучня 12-га класа, раней судзімага за вымагальніцтва. Хлопцы, як паказвае іх крымінальны ўчынак, не зрабілі правільныя высновы і так і не навучыліся сябраваць з законам. Заведзена крымінальная справа.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Аляксандр ЯКАБСОН: «СЁННЯ ТОЛЬКІ ВЕДЫ ВЫЗНАЧАЮЦЬ УЗРОВЕНЬ АБІТУРЫЕНТА»

**УСТУПНАЯ кампанія 2011 года пераваліла за экватар. Па шасці вучэбных прадметах (беларуская мова, руская мова, гісторыя Беларусі, матэматыка, грамадазнаўства, хімія) ужо адбылося цэнтралізаванае тэсціраванне. Сёння абітурыенты ўдзельнічаюць у тэсціраванні па сусветнай гісторыі найноўшага часу. Учора журналіст газеты «Звязда» па запрашэнні КДК мела магчымасць разам са старшынёй Камітэта дзяржаўнага кантролю Аляксандрам ЯКАБСОНАМ прысутнічаць на той частцы тэсціравання па хіміі, на якую яшчэ могуць быць дапушчаныя староннія людзі.**



І тое, па асобным дазволе. Напрыклад, спісы журналістаў, якім дазволілі да пэўнага часу знаходзіцца ў вучэбных аўдыторыях галоўнага корпуса Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, былі ўзгоднены са старшынёй дзяржкамісіі Анатолем РУБІНАВЫМ. Ім жа быў выдадзены і аднаразовы пропуск Аляксандру Якабсону. Пры гэтым і старшыня КДК, і журналісты маглі назіраць за працэсам толькі да моманту адкрыцця канверта з тэставымі заданнямі. «Таму што ніводны чалавек, якую б ён пасаду ні займаў, не можа ўмешвацца ў працэс тэсціравання», — патлумачыла **начальнік галоўнага ўпраўлення кантролю за працай галін сацыяльнай сферы КДК Ала МІКАЛУЦКАЯ**.

На Камітэт дзяржаўнага кантролю, у адпаведнасці з Указам кіраўніка дзяржавы, ускладзена арганізацыйна-тэхнічнае забеспячэнне дзейнасці дзяржаўнай камісіі. Гэта значыць, што на базе КДК працуе міжведамасная працоўная група. У рэгіёнах кантроль і каардынацыю ажыццяўляюць абласныя камісіі, якія ўзначальваюць старшыні абласных камітэтаў дзяржкантролю. На базе цэнтральнага апарату Камітэта, абласных камітэтаў працуюць тэлефоны «гарачай лініі». *(Тэлефон працоўнай групы дзяржаўнай камісіі 227 - 66 - 80).*

Кантроль у навучальных установах ажыццяўляюць камісіі, у якіх работнікі КДК з'яўляюцца намеснікамі старшынь. А старшынямі — вышэйшыя службовыя асобы. Усяго ў цэнтралізаваным тэсціраванні сёлета ўдзельнічаюць каля 260 супрацоўнікаў органаў КДК.

**Старшыня камісіі ў Беларускім дзяржаўным медыцынскім універсітэце, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Мікалай ЖГУН**, дакументы якога таксама дасканала праверылі перад тым, як пусціць у корпус, перад пачаткам тэсціравання далажыў старшыні Камітэта дзяржкантролю, што сёння, як і ў папярэднія дні, ніякіх праблем у арганізацыі тэсціравання не ўзнікла. Ужо а палове восьмай раніцы фельд'егерская служба ў прысутнасці супрацоўніка КДК даставіла ў навучальную ўстанову пакеты з бланкамі заданняў і чыстымі бланкамі адказаў. Гэтых пакетаў столькі, колькі аўдыторый будзе задзейнічана ў дзень тэсціравання, плюс адзін рэзервовы на выпадак паліграфічнага браку. Пакеты з заданнямі і бланкамі адказаў былі змешчаны ў сейф, які тут жа апячаталі.

Учора ў медуніверсітэце тэсціраванне па хіміі адбывалася ў 7 аўдыторыях. З 653 чалавек 11 абралі мову тэсціравання беларускую, таму ім было прадастаўлена асобнае памяшканне. Ля спісаў абітурыентаў Аляксандр Якабсон звярнуў увагу на тое, што не ўсе прозвішчы тых, хто абраў беларускую мову, напісаны па-беларуску.

— Магчыма, прозвішчы напісаны так, як і ў пропуску, — выказаў меркаванне Мікалай Жгун.

Пасля гэтага журналісты сталі відавочцамі лёсавання, якое размеркавала адказных (педагогі і прадстаўнікі грамадскасці) па аўдыторыях. Лёсаванне гарантавала, што ніхто з прысутных на тэсціраванні загадзя не ведае, у якой аўдыторыі ён будзе знаходзіцца. Падобнае лёсаванне праходзяць і абітурыенты, калі перад уваходам цягнуць паперку з нумарам свайго месца. «Размяшчэнне маладых людзей дасканала прадумана, — тлумачыць Ала Мікалуцкая, — каб не адбылося, што побач сядзяць тыя, хто піша адзін і той жа варыянт».

Нарэшце, у прысутнасці прадстаўнікоў грамадскасці, членаў дзяржкамісіі быў адкрыты апячатаны сейф, раздадзены запячатаныя пакеты з бланкамі адказаў і заданнямі кур'ерам, якія разнеслі іх па аўдыторыях.

Тым часам амаль усе зарэгістраваныя на тэсціраванне занялі свае месцы. На ўваходзе ў іх ужо праверылі дакументы, папярэдзілі пра тое, якім калькулятарам можна карыстацца, а таксама пра неабходнасць здаць асабістыя рэчы ў гардэроб. Тых, хто спазняўся, пускалі да таго моманту, пакуль не адкрыты пакет з заданнямі. Некалькі чалавек так і не прыйшлі.

...Мы знаходзімся ўнутры будынка апошнія хвіліны перад тым, як на дзве гадзіны дзверы аўдыторыі будуць зачынены для ўсіх староннніх людзей. Андрэй Слука ў аўдыторыі №6 спрабуе разрадзіць атмасферу, калі яшчэ раз расказвае, які калькулятар дазваляецца мець на стале: «Там не павінна быць ніякіх літар, ніякіх раз'ёмаў, а толькі лічбы, знакі арыфметычных дзеянняў і ў выглядзе выключэння — знак «роўна»... Жарт дзейнічае, па аўдыторыі праносіцца лёгкі смех, і вось ужо ўсім не так страшна.

Мы разам з абітурыентамі ўважліва слухаем, як запаўняць бланк адказу. Потым бачым, як упаўнаважаны перакрыжоўвае нявыкарыстаныя бланкі і кладзе іх у пакет. Бланкі з заданнямі будуць раздадзены ў адпаведнасці са схемай, па якой рассаджаны абітурыенты. Пры гэтым, пакуль апошні чалавек не атрымае задання, ніхто не мае права глядзець ужо раздадзены варыянт (бланк кладзецца пад бланк з адказам). Цяпер чарга на пакет з заданнямі. Андрэй Слука бярэ нажніцы, але перад тым, як ён разрэжа пакет, мы разам з Аляксандрам Якабсонам пакідаем аўдыторыю.

— На свае вочы я пераканаўся ў тым, што, акрамя саміх абітурыентаў, ні бог, ні цар, ні воінскі начальнік не можа паўплываць на вынікі тэсціравання, — падзяліўся ўражаннямі пасля ўсяго ўбачанага старшыня КДК. — Гэтая сістэма адладжана за апошнія гады і сёння працуе, незалежна ад абставін. Усё адбываецца пад жорсткім кантролем. Мяне прыемна здзівіла тое, што нават хвіліна пачатку прагляду заданняў ва ўсіх абітурыентаў, якія знаходзяцца ў аўдыторыі, адна. Ніхто не мае права скарыстацца тым, што ліст з заданнямі яму быў раздадзены раней. Гэта сведчыць, што тут адточаны ўсе дэталі працэсу, таму прэтэнзій ніякіх не ўзнікае... Я ўзгадваю час, калі сам паступаў у ВНУ, і бачу, што ў параўнанні з сённяшнім днём гэта дзень і ноч. Сёння ўсё пабудавана так, што толькі веды могуць вызначыць узровень абітурыента.

Аляксандр Якабсон заўважыў, што парушэнні з боку абітурыентаў, інфармацыя пра якія паступае ў Камітэт дзяржкантролю і дзяржаўную камісію, у асноўным датычацца спроб пранесці ў аўдыторыю сотавыя тэлефоны альбо іншыя ўстройствы, якія могуць перадаваць інфармацыю. Такіх спроб вельмі мала — на раніцу 22 чэрвеня падчас цэнтралізаванага тэсціравання 2011 года з аўдыторый былі выдалены толькі 33 чалавекі па ўсёй краіне.

Старшыня Камітэта дзяржкантролю заўважыў, што дзяржкамісія і Камітэт вельмі ўважліва ставяцца да меркавання бацькоў абітурыентаў, педагогаў, а таксама ўдзельнікаў тэсціравання. Заўваг паступае няшмат, некаторыя заслугоўваюць увагі. Напрыклад, частка бацькоў лічыць, што можна было б пашырыць колькасць прадметаў, якія тэсціруюцца, з трох да чатырох. Гэта дало б магчымасці абітурыенту для манеўру пры выбары той або іншай спецыяльнасці, але выкліча дадатковыя выдаткі. «На дзяржкамісіі па выніках цэнтралізаванага тэсціравання мы абмяркуем гэтую і іншыя прапановы, а таксама заўвагі, якія паступяць», — паабяцаў Аляксандр Якабсон.

Сёлета паўтарылася «традыцыйная» памылка абітурыентаў — спазненне з рэгістрацыяй.

— Пакуль гэта носіць дастаткова масавы характар, потым да нас звоняць са слязамі і ўгаворамі. Але правіла ёсць правіла, і адступаць ад яго нельга. Калі вы спазніліся на самалёт, то вам нічога не застаецца, як чакаць наступнага рэйсу. Так і тут. Выключэнняў быць не можа, — сказаў старшыня КДК.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

УНП 200050191
28 июня 2011 в 15.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Полесьежилстрой».
Повестка дня:
1. Об изменении размера уставного фонда общества.
2. О внесении изменений и дополнений в устав общества и утверждении устава в новой редакции.
3. О материальном вознаграждении членов совета директоров.
Собрание будет проходить по адресу: г. Брест, ул. Базановой, 19.
Начало регистрации участников собрания: 14.30.

## Тваё правы: БЕЗ ВАРЫЯНТАЎ «СУМЯШЧЭННЯ»

Сяргей ГРЫБ

**ЖАДАННЕ працаваць ці вучыцца цалкам зразумелае. Але мы мяркуем, абставіны ж могуць складвацца зусім іншым чынам. І калі-нікалі здараецца так, што ўзнікае неабходнасць даглядаць кагосьці з блізкіх ці проста знаёмых людзей. Прычым варта заўважыць: у выпадку догляду за інвалідам І групы ці састарэлым, які дасягнуў 80-гадовага ўзросту, існуе магчымасць атрымліваць дапамогу. Праўда, тут адразу ж неабходна зрабіць істотную агаворку: такая дапамога прызначаецца і выплачваецца толькі пры пэўных умовах.**

### Патрэбу вызначаюць медыкі

Трэба мець на ўвазе, што галоўная ўмова прызначэння дапамогі — медыцынскае пацвярджэнне таго, што інвалід І групы або пенсіянер ва ўзросце больш за 80 гадоў сапраўды не можа абысціся без пастаяннага догляду. У прыватнасці, для інваліда І групы такім пацверджаннем з'яўляецца выпіска з акта агляду медыка-рэабілітацыйнай камісіі, а для асобы ва ўзросце 80 і больш гадоў — заключэнне ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі, якое даецца бальніцай, шпіталем, медыка-санітарнай часткай, дыспансэрам ці паліклінікай.

— Нялішне заўважыць, што прызначэнне дапамогі на догляд за інвалідам І групы ці састарэлым, які дасягнуў 80-гадовага ўзросту, цяпер адносіцца да адміністрацыйных працэдур, — распавядае начальнік аддзела прызначэння і выплаты пенсій камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Ала Колбік. — Таму ў такім выпадку чалавек, які вырашыў аформіць на сябе догляд, можа прадаставіць у раённае ўпраўленне сацыяльнай абароны толькі заяву, пашпарт ці іншае пасведчанне асобы, а таксама працоўную кніжку. Усе астатнія дакументы, і ў тым ліку заключэнне медыкаў, спецыялісты ўпраўлення збяруць самі. Прычым ад часу падачы заявы да моманту прыняцця рашэння аб прызначэнні ці непрызначэнні дапамогі павінен прайсці не больш чым месяц.

### Догляд — адзіны занятак

Разам з тым, медыцынскага пацвярджэння патрэбы ў пастаянным доглядзе яшчэ недастаткова. Заканадаўства вызначае: чалавек, які збіраецца ўзяць на сябе клопаты аб інвалідзе І групы ці састарэлым ва ўзросце больш за 80 гадоў і атрымліваць дапамогу, павінен быць працаздольным. Але пры гэтым не працаваць, не займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю, не вучыцца на дзённых аддзяленнях вышэйшых, сярэдніх спецыяльных або прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў, не атрымліваць пенсіі ці дапамогі па беспрацоўі, страхавых выплат у выніку няшчасных здарэнняў на вытворчасці і прафесійных захворванняў, штомесячнага грашовага ўтрымання паводле заканадаўства аб дзяржслужбе.

— Чалавек, які прэтэндуе на дапамогу, мусіць займацца менавіта доглядам за непрацаздольным грамадзянінам, — падкрэслівае Ала Колбік. — Таму «сумяшчэння» догляду з пералічанымі вышэй відамі занятасці наша заканадаўства не прадугледжвае. І ў тым ліку атрымальнік дапамогі не можа быць заняты на ўмовах грамадзянска-прававога дагавора.

### Памер у «звязцы» з БПМ

Існуе распаўсюджаная думка, што дапамога на догляд прызначаецца толькі сваякам інваліда І групы ці пенсіянера ва ўзросце больш за 80 гадоў. Гэта не так: ступень сваяцтва не адыгрывае аніякай ролі. Прычым ёсць магчымасць адначасова даглядаць не аднаго, а двух ці нават больш чалавек.

— Непасрэдна памер дапамогі «прывязаны» да бюджэту пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва, — распавядае Ала Колбік. — Так, у выпадку догляду за адным інвалідам І групы ці састарэлым, які дасягнуў 80-гадовага ўзросту, выплата складае 65 працэнтаў, а ў выпадку адначасовага догляду двух і больш чалавек — 100 працэнтаў БПМ. Дарэчы, бюджэт пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва з улікам індэксу спажывецкіх цэн змяняецца штоквартальна — напрыклад, цяпер ён адпавядае 343.260 рублям.

Аднак магчымасць атрымліваць дапамогу — варыянт не адзіны. Апроч таго, трэба адзначыць: час догляду за інвалідамі І групы ці пенсіянерамі ва ўзросце больш за 80 гадоў, якім неабходна пастаянная дапамога, залічваецца ў стаж для прызначэння пенсіі.

### Як пазбегнуць пераплаты?

Не сакрэт, што тэрмін вызначэння інваліднасці І групы ці заключэння УКК аб неабходнасці догляду за састарэлым ва ўзросце больш за 80 гадоў можа быць абмежаваным. Адпаведна, у такім выпадку будзе абмежаваным і час атрымання дапамогі. І калі групу «зменшаць» або будзе прызнана, што пенсіянер ва ўзросце больш за 80 гадоў патрэбы ў пастаянным доглядзе ўжо не мае, то права на дапамогу знікне.

— Калі ж І група інваліднасці ці неабходнасць догляду за састарэлым, які дасягнуў 80-гадовага ўзросту, вызначаны бестэрмінова, то дапамогу на догляд таксама прызначаць бестэрмінова, — заўважае Ала Колбік. — Аднак нельга скідваць з рахункаў адну акалічнасць: асоба, якая здзяйсняе догляд, можа страціць права на дапамогу па іншых прычынах. Да такіх прычын, у прыватнасці, адносяцца прызначэнне любога віду пенсій, страта працаздольнасці, уладкаванне на працу, пачатак навучання на стацыянары, пачатак прадпрымальніцкай дзейнасці, прызначэнне дапамогі па беспрацоўі, заканчэнне тэрміну віду на жыхарства ў Беларусі, прызначэнне страхавой выплаты ў выніку няшчасных здарэнняў на працы і прафесійных захворванняў, змяшчэнне інваліда І групы ці састарэлага ва ўзросце больш за 80 гадоў у стацыянарную арганізацыю сацыяльнага абслугоўвання ці ў бальніцу на «сястрынскія ложкі». І, да слова, у выпадку ўзнікнення падобных акалічнасцяў асоба, якая здзяйсняе догляд, павінна на працягу 5 дзён паведаміць аб іх у раённае ўпраўленне сацыяльнай абароны. Інакш дапамога працягне выплачвацца незаконна, узнікне яе пераплата, а пераплату давядзецца вяртаць — і ў тым ліку тут існуе варыянт вяртання ў судовым парадку.

## Абзац

◢ Амаль 600 працаўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый Віцебскай вобласці звольнены ў студзені—маі за знаходжанне на працоўным месцы ў стане алкагольнага ап'янення, у тым ліку 3 кіраўнікі і 28 службовых асоб.

◢ **Студэнта 1-га курса БНТУ знайшоў 21 чэрвеня (малады чалавек вісеў у пятлі) яго бацька ў здымнай кватэры. Хлопец павесіўся на камп'ютарным провадзе. Па папярэдняй інфармацыі, суіцыд ён здзейсніў з-за нядопуску да здачы сесіі.**

◢ Дзень цюльпанавага дрэва пройдзе ў Цэнтральным батанічным садзе НАН Беларусі 25 чэрвеня. У гэты дзень усе ахвотныя змогуць палюбавацца цвіценнем рэдкага дрэва, а супрацоўнікі сада раскажуць гісторыю яго з'яўлення ў Мінску. Таксама будуць арганізаваны бясплатныя экскурсіі па плантацыі руж. Каля экспазіцыйнай аранжарэі будзе арганізаваная выстава-продаж эксклюзіўных пакаёвых раслін і саджанцаў субтрапічных дэкаратыўных раслін: граната, інжыра, банана, лімонаў розных гатункаў.

◢ **Грамадзянін Літвы спрабаваў незаконна ўвесці ў Беларусь праз пункт пропуску «Каменны Лог» 160 слоікаў стаматалагічных матэрыялаў (вагой амаль 3 кг), якія выкарыстоўваюцца для вырабу зубных пломбаў, а таксама 90 цюбікаў з клеявым саставам. Сума тавару ацэньваецца амаль у Br24 млн. Кантрабанду выявілі ў паўпрычэпе аўтамашыны «Вольва», на якой літовец заязджаў у Беларусь.**

◢ У Гомельскай вобласці адзначаецца рэзкі рост веласіпедных крадзяжоў. Падобныя злачынствы здзяйсняюцца практычна штодня. Крадуць не толькі тыя веласіпеды, якія пакінуты без нагляду на вуліцах і ў пад'ездах. Так, у вёсцы Бабоўка Жлобінскага раёна невядомы дзеля «Бусла» ўскрыў гараж. А ў Мазыры — па пажарнай лесвіцы падняўся на балкон кватэры, дзе стаяў горны веласіпед «Кельт».

◢ **Кіроўца аднаго з мінскіх прадпрыемстваў з сабутэльнікам абрабаваў жанчыну, а затым сам прыйшоў у міліцыю і ва ўсім прызнаўся. Позна ўвечары кампанія з чатырох чалавек распівала спіртное ў сталічным парку па вуліцы Ташкенцкай. Выпіўкі аказалася малавата, а грошай на працяг не было. Тады адзін з гуляк сарваў з пляча жанчыны, якая праходзіла міма, сумачку, у якой знаходзілася каля Br150 тыс. і асабістыя рэчы. Працверазеўшы, мужчына зразумеў, што ён стаў удзельнікам здзяйснення злачынства, і разам з выкрадзеным накіраваўся ў міліцыю. Праводзіцца расследаванне. Не выключана, што фігурант, які прыйшоў у міліцыю, будзе вызвалены ад крымінальнай адказнасці.**

### Поўны абзац

◢ Адзін з найбагацейшых бізнэсменаў Ганконга, кіраўнік дэвелаперскай кампаніі Henderson Land Development Лі Чжаоцзі, раздасць сваім службоўцам два мільёны долараў у якасці бонусаў з нагоды нараджэння свайго шостага ўнука. Прэміі атрымаюць паўтары тысячы працаўнікоў. Багацце бізнэсмена ацэньваецца ў 19 мільярдаў долараў.

◢ **У Дагестане заведзена крымінальная справа ў дачыненні супрацоўнікаў пенсійнага фонду, якія спрабавалі незаконна сабраць з пенсіянераў грошы. Па словах пенсіянераў, супрацоўнікі фонду сцвярджалі, што грошы патрэбны на хабар рэвізорам. Яны пагражалі, што без хабару рэвізоры паменшаць памеры пенсій.**

◢ Сямігадовы жыхар штата Мічыган угнаў машыну сваёй маці, каб паехаць да бацькі, які жыве асобна. Хлопчык здолеў праехаць за рулём каля 32 кіламетраў. Пры гэтым на некаторых участках хуткасць аўтамабіля Pontiac Sunfire перавышала 80 кіламетраў у гадзіну. На паўдарозе яго затрымалі паліцэйскія.

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

# НАТАТКІ ШПІЁНА

## ЯК Я ЗДЫМАЎСЯ Ў ТЭЛЕКАНЦЭРЦЕ ЛЯ СЦЕН МІРСКАГА ЗАМКА

**Ці ядуць беларускія «поп-ідалы» звычайныя беляшы? Як людзі рэагуюць на беларускую мову? Якія пікантнасці адбываюцца за кулісамі раскручанага канцэрта, які паказваюць па тэлебачанні? Што будзе чакаць вас, калі надумаеце зрабіцца артыстам? У скуры спевака пабываў журналіст «Звязды» Яўген Валошын. І напісаў пра свае колкія ўражанні.**


Тэлевізійны стоп-кадр. Журналіст «Звязды» прымае ўдзел у канцэрце.

*— Вам што даваць, каньяк?* — агледзелі мяне тры дзелавыя цётачкі з гандлёвай палаткі, якая стаяла непадалёк ад канцэртнай сцэны. Асартымент кропкі, як на Дзень горада ў сталіцы: беляшы, сасіскі ў цесце, піва, катлеты «Папараць-кветка»; усе гэтыя опцыі беларускага фастфуду падаграваюцца ў мікрахвалёўцы.

Ад каньяку я адмовіўся, бо прыехаў на канцэрт на сваёй машыне. Але папытаўся ў цётачак, ці куплялі ў іх беляшы якія-небудзь «багі» беларускай эстрады.

— *Ціхановіч з Ярмоленкам падыходзілі,* — дзелавым тонам хваліліся жанчыны. — *Пра каньяк пыталіся, але не купілі. Праходзіў тут і Саладуха, але толькі адным вокам зазірнуў...*

Гэтым разам выступаць на вялікай сцэне рыхтаваўся і я са сваім гуртом HandmadE. Чытачы «Звязды», напэўна, ведаюць, што гэты музычны калектыў быў на першым этапе заснаваны журналістамі газеты. Пра нашы патугі скарыць айчынную сцэну неаднаразова распавядалася *(«Як мы прарываліся ў беларускі шоу-бізнэс», нумар за 31 снежня 2009 года, «Загрыміруем цябе так, што родная маці не пазнае», нумар за 25 студзеня 2011 года і інш.).*

Жанчына-адміністратар павяла нас у імправізаваную грымёрку, якую мы дзялілі з гуртом «Без білета». Ішоў я з адкрытым ротам, бо ў радыусе якіх-небудзь 50-і метраў пабачыў шмат знакамітых музыкаў — Івана Кірчука (этна-трыа «Троіца»), рок-князёўну Вераніку Круглову, гурт «Стары Ольса» ў поўным складзе...

Гэтым вечарам у межах праекта «Вечары ў Мірскім замку», які зладзіў тэлеканал АНТ, меліся адбыцца два канцэрты — фольк- і рок-музыкі.

За некалькі дзён да нашага прыезду якраз тут здымалі «Песню года», «Вечар раманса», творчы вечар двух Эдуардаў — Хіля і Ханка...

Грымёркі размяшчаліся ў вялізным брызентавым намёце і былі аддзелены адна ад адной чорным поліэтыленам. У кожным такім імправізаваным пакойчыку стаялі крэслы, стол, люстэрка і асвятляльны пражэктар. На калідоры арганізавалі халодную ды гарачую ваду, можна было гатаваць каву па-варшаўску.

На сцэне ваўсю рэпеталі фольк-гурты, а я выйшаў на двор і вырашыў агледзецца. На Мірскі замак насоўвалася падазроная чорная хмара, і мажная цётачка, з бэйджыкам STAFF, спрытна абкручвала глядацкія крэслы празрыстай плёнкай. Неўзабаве нас патрывожылі першыя кропелькі дажджу.

— *І на папярэдніх канцэртах ліло. Даводзілася людзям падстаўляць парасоны,* — махнула рукой на кропелькі дзяўчына-адміністратар.

Гурт HandmadE выклікалі на так званы саўнд-чэк. Гэта калі ты трэніруешся на сцэне, а гукарэжысёр наладжвае пад цябе мікрафоны, выводзіць гукавыя ўзроўні, каб на канцэрце ўсё выйшла ладна.

Пасля мы выправіліся на праменад па Міры, пакаштавалі шашлыкоў на мясцовым кірмашы.

Агулам да канцэрта мы шпацыравалі па ваколіцах аж дзевяць гадзін. Такая яна, доля беларускага артыста.


Канцэртную сцэну ўжо каторы год усталёўваюць побач з легендарным Мірскім замкам.

### Спазніўся на сцэну — пралятай міма тэлевізара

Вой ужо гэты кірмаш, з ежай і півам! Сяму-таму ён здорава нашкодзіў. Адзін з гуртоў у поўным складзе тут здорава засядзеўся, хлопцы спазніліся на сцэну і праляцелі міма канцэрта.

— *Глядзі, у якой яны жалобе! Сачы, каб твой гурт не спазніўся,* — папярэдзіла мяне адміністратар, што адказвала за нас.

Некаторыя гурты паспелі за час чакання пазабаўляцца ў іншых населеных пунктах.

— *Мы з карэліцкай дзяўчынай звязаліся. Мае хутар. У госці да яе паехалі, у лазні папарыліся. Я табе кажу — цуд,* — хваліўся спрытны барабаншчык гурта «Жнюв», збіраючыся выходзіць на сцэну.

Нягледзячы на перыядычны дождж, людзі занялі амаль усе крэслы. Я ж у гэты час наведаўся ў грыміровачны пакой. Не ўсе рокеры лічаць патрэбным грымíравацца, але мяне збіралася глядзець па АНТ бабуля, якая, напэўна ж, жадала пабачыць унука «гожым».

Грымёркі з артыстамі хадзілі хадуном. За дзевяць гадзін чакання пра што толькі не размаўлялі — пра мову, Лондан, грошы, інструменты, сэксуальную арыентацыю. Каньяк з беляшовага шапіка выграблі падчыстую. Музыкі разаграваліся, і, напэўна, толькі адзін я трохі хваляваўся, каб патрапіць ва ўсе ноты.

— *Гэта нармальна,* — размераным голасам навучаў мяне Віталь Артыст з гурта «Без Білета». — *Я кожны раз усхваляваны перад выступленнем. Калі ў цябе няма належных эмоцый, значыць нешта не так...*

Мы выступалі перадапошнімі. Наладзілі гітары, параспяваліся ў грымёрцы.

— *Гурт HandmadE — вы наступныя,* — нарэшце паклікалі нас тэлевізійшчыкі.

Але здарылася непрадказальнае: адзін з нашых гітарыстаў, сямейны і дысцыплінаваны чалавек, раптоўна знік.


Прадавачкі шапіка з беляшамі на пытанне аб «багах» беларускай эстрады перш-наперш узгадалі Аляксандра Ціхановіча.

### Сюрпрызы жывога канцэрта

— *Я ўжо тройчы тут усё аббегала, яго няма, абсалютна нідзе,* — гаравала Крысціна, дырэктар нашага гурта.

— *Беляшы!!!* — ускрыкнуў я, прадказваючы самае страшнае. — *Бяжы да біятуалетаў, грукайся, выцягвай любымі спосабамі. Праляцім як фанера над Карэлічамі.*

Але за секунды да выхаду на сцэну наш халаднакроўны гітарыст прыбег. Аказалася, ён слухаў папярэдні гурт (Tanin Jazz), «замаскіраваўшыся» ў гледача.

На гэтым сюрпрызы не скончыліся. Пасля таго, як нас прадставілі вядоўцы (Дзядзя Ваня і Каця Пытлева), я зацягнуў нашу першую песню. А некаторыя гледачы нечакана пачалі падпяваць.

— *У цябе ж спачатку гітара не іграла, а ты давай выконваць акапэльна, як той дзяк,* — рагаталі пасля канцэрта сябры, што прыехалі паслухаць нас у Мір. — *Людзі падумалі, што гэта заводка, і давай падпяваць. Потым далучыліся бас, бубны, акардэон, і ўсё пайшло як на парадзе...*

Пасля нас канцэрт феерычна завяршаў гурт «Без Білета». Дождж ліў як з вядра. Людзі паўскоквалі з месцаў, але амаль ніхто не сыходзіў. Людзі атрымлівалі задавальненне, і нікога не трэба было трымаць.

**P.S.** *Паглядзець запіс канцэрта «Музычныя вечары ў Мірскім замку». «Жывы рок», пра які я напісаў у гэтым артыкуле, можна сёння ў 23.10.*

**Яўген ВАЛОШЫН. Фота тэлеканала АНТ і Дзмітрыя РУДЭНКІ.**

### БЕЛАРУСКІЯ МАС-МЕДЫЯ ПАЧАЛІ РАСКРУЧВАЦЬ «ЖЫВУЮ» МУЗЫКУ?

Доўгія гады на ўсіх нашых каналах, на радыёстанцыях гучала безнадзейная папса. Безнадзейная — таму што, на мой погляд, культавых спевакоў у нас так і не з'явілася. У асноўным эстрада складалася з неабцясаных фанаграмшчыкаў. Некалі цікавыя артысты састарэлі і выконвалі ролю статыстаў, а маладыя «зоркі» ў пераважнай большасці няздольныя скласці хоць якую-небудзь рынкавую канкурэнцыю ўкраінцам і расіянам. А калі і складалі, то гэтых артыстаў раскручвалі за мяжой. Сярогу, Дзіму Калдуна... Але гэта рэдкія выпадкі. Ды і папсой названых выканаўцаў называць не выпадае.

Іншая сітуацыя з нашай альтэрнатыўнай музыкай. Менавіта гэта беларускі канёк. Узгадайце культавых «Песняроў», якія за савецкім часам на пачатку кар'еры лічыліся альтэрнатывай, апальным гуртом. А ў выніку сталі першым гуртом з СССР, якіх запрасілі ў ЗША, якія гучалі з кожнай дзіркі...

І вось нарэшце прагрэсіўную альтэрнатыўную музыку пачалі паціху-памалу раскручваць на нашым тэлебачанні.

Па маіх назіраннях, гэта тэндэнцыя ў многім звязана з выканаўчым прадзюсарам тэлеканала АНТ Міхаілам Бычанком, меламанам і аматарам якаснай музыкі.

— *Як паказвае практыка, моладзь зараз пачала слухаць больш альтэрнатыўнай музыкі. Мы — маладое тэлебачанне, чаму б не дапамагаць такім гуртам. У нас ёсць па-сапраўднаму якасныя калектывы, яны запісваюцца ў добрых студыях, музыка для іх жыццё,* — разважае Міхаіл Бычанок. — *Калі мы бачым харошы, якасны тэлевізійны прадукт, калі відаць, што хлопцы працуюць, мы заўжды за тое, каб іх падтрымаць. Ёсць нямала маладых, якасных калектываў, якім трэба даць штуршок. Гэта мы робім у праектах «Эстрадны кактэйль», «Музычныя вечары ў Мірскім замку». У такой музыкі ёсць свой слухач, і дастаткова шмат такіх людзей...*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ФІНАНСАВАЯ ДАПАМОГА ГРЭЦЫІ АБЫХОДЗІЦЦА Ў 535 ЕЎРА НА КОЖНАГА ЕЎРАПЕЙЦА



**Даўгі Грэцыі кладуцца цяжкім грузам на плечы ўсіх еўрапейскіх падаткаплацельшчыкаў, піша газета The Warsaw Business Journal.**

Як падлічыў эканаміст Рауль Рупаэль з арганізацыі Open Europe, кожны еўрапеец ускосна аддае па 535 еўра ў якасці фінансавай дапамогі Афінам. Да 2014 года гэтая сума можа вырасці да 1,450 тысячы, упэўнены ён.

Афіны павінны атрымаць чарговыя 12 млрд еўра з пакета дапамогі, які складае ўвогуле 110 млрд, да сярэдзіны наступнага месяца, каб пазбегнуць дэфолту. Зараз краіны ЕС чакаюць ад урада Грэцыі «рэальных крокаў да выканання ўмоў атрымання чарговага крэдыту». Галоўная з умоў — скарачэнне выдаткаў бюджэту на 28 млрд еўра — выклікала бурныя пратэсты сярод насельніцтва, Афіны паралізаваў страйк.

### СІРЫЯ ПАЛІЧЫЛА САНКЦЫІ ЕС АБ'ЯВАЙ ВАЙНЫ

**Міністр замежных спраў Сірыі Валід аль- Муалем заявіў, што яго ўрад разглядае санкцыі, уведзеныя супраць яго краінамі ЕС, як аб'яву вайны, паведамляе Agence France-Presse.**

Што менавіта ў рамках гэтай «вайны» мае намер распачаць кіраўніцтва Сірыі, дыпламат не ўдакладніў.

Раней Еўрасаюз абвясціў санкцыі супраць шэрагу высокапастаўленых сірыйскіх чыноўнікаў, а таксама некалькіх буйных кампаній, звязаных з сірыйскім кіраўніцтвам. Рахункі гэтых людзей і кампаній у Еўропе замарожаны, а чыноўнікам і бізнэсменам забаранілі з'яўляцца на тэрыторыі ЕС. Сірыйскі міністр таксама сказаў, што Дамаск не пацерпіць ніякага вонкавага ўмяшання ва ўнутраныя справы. Ён, у прыватнасці, выключыў магчымасць усталявання над Сірыяй зоны, забароненай для палётаў, ці іншую форму замежнага ваеннага ўмяшання.

### САМАЙ БАГАТАЙ КРАІНАЙ ЕЎРАСАЮЗА ЗНОЎ ПРЫЗНАНЫ ЛЮКСЕМБУРГ

**Такія звесткі даследавання, апублікаванага ў аўторак, 21 чэрвеня, агенцтвам Eurostat, паведамляюць інфармагенцтвы.**

Паказчык узроўню жыцця (па ВУП на душу насельніцтва па парытэце пакупніцкай здольнасці) грамадзян Люксембурга ў 2010 годзе апынуўся на ўзроўні 283 пунктаў ад сярэдняга значэння для 27 краін ЕС, узятага за 100 пунктаў. Узровень жыцця ў Нідэрландах, паводле даследавання, прыкладна на трэць вышэйшы, чым у сярэднім па ЕС (134 пункты). Трэці радок заняла Данія з вынікам 125 пунктаў. У пяцёрку лідараў увайшлі Ірландыя і Аўстрыя. Горшы вынік паказалі Румынія (45 пунктаў) і Балгарыя (43 пункты).

Для 17 краін еўразоны сярэдні паказчык узроўню жыцця склаў 108 пунктаў. Для параўнання, у ЗША значэнне гэтага паказчыка складае 146 пунктаў.

### НЕЗДАРОВАЯ ЕЖА ЗАБІВАЕ КЛЕТКІ МОЗГА

**Тлустыя шкодныя прадукты губяць клеткі мозга, якія кантралююць вагу. Гэта правакуе развіццё атлусцення, папярэджваюць даследчыкі. Гэтая заканамернасць тлумачыць той факт, чаму поўным людзям так цяжка схуднець, піша The Daily Mail.**

Група навукоўцаў пад кіраўніцтвам доктара Джошуа Талера з Цэнтра дыябету і атлусцення пры Універсітэце Вашынгтона карміла пацукоў тыповай ежай, якую есць сярэднестатыстычны амерыканец. Гэта прывяло да таго, што жывёліны сталі спажываць у два разы больш калорый літаральна праз тры дні.



Далейшыя вопыты паказалі: у жывёл таксама было запаленне ў гіпаталамусе, які змяшчае нейроны, што кантралююць вагу цела. Плюс, даследчыкі зафіксавалі адказ на траўму мозга пад назвай «гліёз». Гэты працэс запускаецца ў адказ на згубу нервовай тканіны. Падобнае можна назіраць пры інсульце ці рассеяным склерозе.

### У Беларусі прайшлі міжнародныя вучэнні на выпадак узнікнення яшчуру

У Гомельскім раёне ў іх прымалі ўдзел ветэрынарныя службы Беларусі, Расіі і Украіны.

— Міжнародныя вучэнні ветэрынарных службаў такога разгорнутага маштабу праводзіліся ў Беларусі ўпершыню, — адзначыў **галоўны дзяржаўны ветэрынарны інспектар Беларусі Юрый ПІВАВАРЧЫК**.

Вынікі вучэнняў вельмі высока ацанілі і міжнародныя назіральнікі — спецыялісты з Малдовы, Таджыкістана, Выканаўчага камітэта СНД.

**Надзея ДРЫЛА.**

## Факт

### НАЧНЫ НАЛЁТ

**У Драгічыне цэнтральная райбальніца агароджана бетонным плотам. Вось над ім і «папрацавалі» невядомыя вандалы, ад чаго бальніца панесла мільённыя страты.**

Падчас начнога налёту 32 пралёты былі знішчаны, а яшчэ многія пашкоджаны. Хуліганаў шукае міліцыя.

### ПРАГАЛАДАЛАСЯ?

Жыхарка пас. Арэхаўскі, працуючы прадаўцом крамы Кобрынскага райспажыўтаварыства, з 4 лютага па 2 чэрвеня гэтага года здолела прысвоіць прадуктаў на больш чым 10 млн рублёў. У выніку — крымінальная справа.

### ПРАДПРЫМАЛЬНЫ ПАЛЯВОД

**50-гадовы жыхар в. Савічы (Баранавіцкі раён) працаваў палядводам і за адно вырошчваў на сваім прысядзібным участку мак. А калі той выспеў, то на макавую саломку знайшліся пакупнікі.**

За паляводам устанавілі нагляд, а падчас вобыску знайшлі ў яго амаль 2,5 кг макавай саломкі. Суд прыгаварыў мужчыну да пяці гадоў калоніі строгага рэжыму.

### НЕ ЎТРЫМАЎСЯ

Майстар будаўнічага ўпраўлення, які жыве ў Пінску, быў матэрыяльна-адказнай асобай і ўкраў з аб'екта па вул. Ракасоўскага 1600 кг грунтоўкі, 200 кг шпаклёўкі, 504 кг клею... і нанёс страты прадпрыемству на 6 641 934 рублі. Майстар грошы вярнуў, але крымінальнай справы не пазбег.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

### ЗАТРЫМАЛІ РАЗАМ З РАСІЙСКІМІ ПАМЕЖНІКАМІ

**Супрацоўнікі Лёзненскага РАУС ля гадзіны ночы разам з супрацоўнікамі Віцебскай мытні і пагранічнай службы Расійскай Федэрацыі затрымалі ля вёскі Дразды «ЗІЛ» і «ГАЗ», на якіх везлі лом чорнага металу.**

Груз — усяго сем тон коштам 5,4 мільёна рублёў — везлі двое беспрацоўных беларускіх грамадзян — жыхары прыгранічча. Лом канфіскавалі.

### З-ЗА РЭЎНАСЦІ СТРАЛЯЎ У СУСЕДА

**67-гадовы жыхар Мёрскага раёна асуджаны за раненне суседа стрэламі з ружжа. З суседам, так бы мовіць, «не падзяліў» жанчыну.**

Стары і параўнальна малады сусед, якому 55 гадоў, сябравалі, часта разам былі ў адной кампаніі. У суседа была сужыцелька. Аднойчы яна разам з мужчынамі выпівала ў доме пенсіянера. Калі выпілі віна, яе каханы пайшоў на работу — на ферму. Жанчына засталася ў гасцях.

Потым утраіх выпівалі ўжо дома ў сужыцеляў. Справа перайшла ў крымінальную фазу, калі пенсіянер ужо пасля таго, як вярнуўся дамоў, зноў накіраваўся да суседзяў, каб «патрабаваць спаткання» з жанчынай. Зразумела, яе мужчына быў супраць, завязалася невялікая бойка. Атрымаўшы кухталёў, пенсіянер паабяцаў вярнуцца са стрэльбай. Прыйшоў са зброяй у руках. У першы раз стрэліў у паветра, а яшчэ два разы — у суседа.

Як паведаміў «Звяздзе» памочнік пракурора Мёрскага раёна Сяргей Галімбоўскі, пенсіянер атрымаў шэсць гадоў пазбаўлення волі ў папраўчай калоніі ўзмоцненага рэжыму. Ён будзе прымусова лячыцца ад алкагалізму. Судовая калегія абласнога суда не задаволіла касацыйную скаргу і пакінула рашэнне раённага суда ў сіле.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### ПАЎТАРА ГЕКТАРА ДЗІКАРОСЛЫХ КАНОПЛЯЎ

**Гэтую плантацыю аператыўнікі Кастрычніцкага РАУС г. Гродна разам з памежнікамі выявілі ў вёсцы Навасёлкі Гродзенскага раёна, прычым паблізу жылых дамоў.**

Вытаптаныя сцежкі сведчылі аб магчымым наведванні гэтага месца наркаманамі, хоць збіраць ураджай яшчэ ранавата. Спалена каля 800 кілаграмаў каноплі, паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама.

### «НАЦЭНКА» САБЕ Ў КІШЭНЮ?

**Аператыўнікі Лідскага райаддзела міліцыі вывелі на чыстую ваду мясцовую жыхарку, якая каля двух гадоў таму несумленным шляхам зарабіла больш за паўмільёна рублёў.**

Дзяўчына тады працавала ў адной з арганізацый трэнерам па таэквандо, і ёй прапанавалі даўкамплектаваць групу ў дзіцячы аздараўленчы лагер. Што яна робіць? На некалькі пуцёвак вызначае... сваю цану. І бацькі плацяць, не адчуўшы падвоху.

Заведзена крымінальная справа па факце махлярства. Праўда, дзяўчына сваю віну не прызнае, маўляў, усе грошы аддавала па прызначэнні. Аднак вынікі аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў трактуюць сітуацыю інакш.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

Тэніс

## Беларускі з перамог стартавалі на Уімблдоне

### Акрамя гульні, Азаранка ўразіла англійскую публіку гучным лямантам падчас матча

**У Лондане стартаваў турнір Вялікага шлема Уімблдон, знакаміты сваёй асаблівай чапурыстасцю. Тэнісісткі, напрыклад, могуць выходзіць на корт толькі ў белым. Ніхто пакуль дрэс-код не парушыў, хоць белы балахон Вінус Вільямс, які, як адзначыла сама тэнісістка, падобны на джэмпер, выклікаў нямала шуму. Нашы тэнісісткі, якія на старце парадавалі нас дзвюма перамогамі, у адзенні, у адрозненне ад амерыканкі, былі сціплымі. А вось крыкі Вікі Азаранкі падчас матча, якія, як мы і самі ведаем, тое яшчэ выпрабаванне для слыху і нерваў, выклікалі цэлую дыскусію.**

Віка, якая без праблем выйграла стартавы матч супраць славачкі суперніцы Магдалены Рыбарыкавай (6:4, 3:2) (тая з-за траўмы не змагла працягваць барацьбу), гуляць моўчкі наадрэз адмаўляецца:

— Я суправаджаю свае ўдары крыкамі прыкладна з 10 гадоў. Тады мне не хапала фізічнай сілы, а гэта дапамагала мне паскорыцца, біць па мячы мацней. Я не магу перастаць крычаць, бо гэта дапамагае мне ў гульні. Нельга адмаўляцца ад таго, што робіць тваю гульню мацней, — растлумачыла Віка.

Мы, вядома, за перамогі, няхай і з крыкамі, а вось у арганізатараў Уімблдона да Азаранкі ёсць пытанні:

— У гульцоў ёсць магчымасць падаць скаргу з гэтай нагоды. Калі адна тэнісістка гучна крычыць падчас матча, а іншая — не, гэта можа моцна адцягваць увагу. Адпаведна, можна паскардзіцца суддзі. Мы абмяркоўвалі гэта з гульцамі, і спадзяёмся, што гэта дапаможа зменшыць колькасць крыкаў. Аргкамітэт непакоіць, што балельшчыкам як на трыбунах, так і перад тэлевізарамі гэты лямант не падабаецца», — такое меркаванне выказаў старшыня Усеанглійскага клуба Містэр Рытчы.

Застаецца дадаць, што Вікторыя ўразіла англійскую публіку не толькі магутнасцю крыкаў (яны дасягалі 95 дэцыбел), але і працягласцю (1,72 секунды).

Яшчэ адна беларуска, Настасся Якімава (100-ты рэйтынг) таксама прайшла ў другі круг Уімблдона, дарэчы, упершыню ў сваёй кар'еры (да гэтага яна з 2004 года штурмавала вяршыні адкрытага чэмпіянату Англіі і ніколі не праходзіла далей першага раўнда). Яна выйграла ў шведкі Сафіі Арвідсан (71) — 4:6, 6:2, 6:1. У 1/32 яна сустрэнецца з венгеркай Меліндай Цынк.

Матч яшчэ адной беларускі, Вольгі Гаварцовай, быў перанесены з-за дажджу.

**Алена КРАВЕЦ.**


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**У самую кароткую ноч у годзе, з 21 на 22 чэрвеня, каля вёскі Вясёлка, што на Гомельшчыне, пачалося святкаванне самага таямнічага і яркага дахрысціянскага свята. Гушканне на арэлях, карагоды, купальскія песні каля вогнішча і гульні — сёлета зноў паспрабавалі аднавіць традыцыйнае гомельскае святкаванне Купалля. З самага ранку, калі толькі сонца ўстала, дзяўчаты пусцілі вянкі з прыгожага берага Сожа.**

*Гомельская вобласць.*



## ОЙ, РАНА НА КУПАЛА!



## Асвячэнне надмагільнага помніка ксяндзу Пралату Юозасу Бульку




**У нядзелю 26 чэрвеня а 14 гадзіне ва Урачыстасць св. Яна Хрысціцеля пасля Урачыстай Святой Імшы, якая адбудзецца ў 13:00, будзе асвечаны надмагільны помнік ксяндзу Пралату Юозасу Бульку, лаўрэату дзяржаўнай узнагароды «За Духоўнае адраджэнне» і шматгадоваму пробашчу мосарскай парафіі.**

**Ксёндз Аляксей ЮРКАЙЦЬ (Адміністратар парафіі Мосар).**

Пытальнік

## ЧАМУ ВЫСЯКАЮЦЬ ДРЭВЫ? КАБ БЫЎ ПАРАДАК НА ПАЛОСАХ АДВОДУ

**Пытанне ў мяне такое. У нас у калгасе ўздоўж усёй трасы М5 Мінск — Гомель высякаюць усе дрэвы. Прычым, у аўральным парадку. Працавалі аж шэсць раённых арганізацый. Загублена шмат птушак, гнёздаў — экалогія маўчыць. А не зрабі што каля хаты ці высечы якое дрэва, якое садзіў твой бацька ці дзед, тут жа дадуць штраф. А тут, дзе парушаюцца ўсе экалагічныя нормы, ні эколагі, ні санстанцыя нічога не бачаць. І яшчэ, самае галоўнае: на гэтых плошчах, што зноў утварыліся, трэба сеяць зерне, а не траву...**

**Мікалай ЛАПАЦІН,**
*вёска Востраў Рагачоўскага раёна.*

Па просьбе рэдакцыі сітуацыю з высечкай дрэў уздоўж названай чытачом трасы пракаментаваў **выканаўца абавязкаў начальніка Рагачоўскай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Эдуард ДОРАХАЎ**. У прыватнасці, ён зазначыў, што гаворка ідзе найперш пра добраўпарадкаванне палос адводу. Пэўны час іх не даглядалі, і яны пазарасталі — пустазеллем, кустоўем. Апошняе з цягам часу пераўтварылася ў сапраўдныя дрэвы.

— Там, дзе павінны быць палосы лесапасадак, яны застануцца. Толькі шырынёй чатыры метры, а не, скажам, дзесяць метраў. У некаторых месцах павырасталі сапраўдныя кліны лесу. Зноў жа, паралельна на палосах адводу праводзіцца прыбіранне смецця, несанкцыянаваных звалак, — распавёў Эдуард Міхайлавіч.

У некаторых месцах работы па высечцы дрэў вядуцца з мэтай вяртання сельгасвытворцам іх зямель. Усе работы — санкцыянаваныя, перад іх пачаткам канкрэтныя месцы аглядаліся спецыяльнай камісіяй, у тым ліку правядзенне высечкі ўзгаднялася з інспекцыяй прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Колькі яны будуць доўжыцца, сказаць зараз цяжка, бо ўсё залежыць ад канкрэтных аб'ёмаў і фінансавання, наяўнасці патрэбных людскіх і тэхнічных рэсурсаў. Магчыма, і працавалі неяк адначасова шэсць раённых арганізацый, як пра тое зазначыў чытач, што ў іх надарылася такая магчымасць?

— Дакладна можна сказаць толькі адно: гэтыя работы скончацца не заўтра, — дадаў Эдуард Дорахаў. — Тым больш калі ўлічыць, што ў 2013 годзе ў Рагачове і Рагачоўскім раёне запланавана правядзенне «Дажынак». Таму зараз на зямлі наводзіцца парадак і добраўпарадкаванне будзе прадоўжана і надалей.

**ОАО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»**
сообщает о возможности
**изменения размера неустойки с 1% до 0,15%**
от суммы просроченных обязательств
по кредитным договорам за каждый день просрочки
(за исключением случая, когда кредитным комитетом
принято решение в части
изменения размера неустойки до 0,15% и менее)
**по кредитным договорам, заключенным до 12.07.2010 с физическими лицами.**

**Телефон Контакт-центра Банка – 136**
8.00-20.00 – рабочие дни, 8.00-18.00 – выходные и праздничные дни.
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) – по тарифам операторов связи. Консультации оказываются бесплатно.
www.belapb.by
*Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551*

«Прамая лінія»

# Хваробы ад нерваў і задавальнення: як вылечыць першыя і не атрымаць другіх

*(Заканчэнне. Пачатак у нумарах за 18 і 22 чэрвеня.)*

**НА пытанні чытачоў адказаў урач-дэрматавенеролаг, загадчык амбулаторнага дэрматавенералагічнага аддзялення Мінскага скурвендыспансэра Уладзімір ЯРОМІЧ.**

***☎— Таццяна, Мінск. Ці трэба лячыць урэаплазмоз, калі выяўлены ўрэаплазмы $10^3$?***

— Урэаплазмоз выклікае ўмоўна-патагенны мікроб, які не заўсёды патрабуе лячэння. Трэба ведаць, на якім абсталяванні вам рабілі аналіз. У нашым дыспансэры выкарыстоўваюцца сучасныя французскія тэст-сістэмы, крытэрый — $10^4$. Калі менш, лячыць не трэба. Часам нават калі ўрэаплазмаў больш чым $10^4$, але ніякіх скаргаў у пацыента няма, калі ў мазках не павышаны лейкацыты, то можна не лячыць, а station назіраць нейкі час.

***— Пасля лячэння ўрэаплазмы засталіся — $10^2$, а праз нейкі час зніклі...***

— Так, яны могуць знікаць — працуе імунная сістэма. Калі імунная сістэма аслабіцца, урэаплазмы могуць з'явіцца ў аналізах зноў. Але, паўтаруся, гэта не значыць, што іх абавязкова трэба лячыць. Праўда, гэта пытанне лепш вырашаць з вашым доктарам: калі, скажам, вы рыхтуецеся да цяжарнасці, то пажадана, безумоўна, ад урэаплазмаў пазбавіцца...

***☎— Кацярына Дзмітрыеўна, Навагрудскі раён, 80 гадоў. На спіне чорныя бляшкі. Спачатку іх было няшмат, а апошнія гады ўсыпаная ўся спіна і шыя. Спачатку з'яўляецца зуд, чырвоны бугарок, а праз дзень ён чорны, выпуклы, як гузік. Некаторыя вісяць, як завушніцы. Потым на гэтых бугарках верхняе покрыва адслойваецца, але я яго стараюся не чапаць. Праўда, падчас мыцця ён усё роўна адслойваецца, застаецца чорная пляма. Якую параду вы мне дасце? Толькі не адсылайце мяне да раённых урачоў, я чалавек хворы, даехаць не змагу...***

— Без агляду складана сказаць, але хутчэй за ўсё ў вас узроставыя змяненні скуры, якія называюцца кератомамі. Пазбавіць вас ад іх можа толькі ўрач-касметолаг. Адзінае, што магу вам параіць, — іх нельга траўмаваць. Гэта ўсё, што вы можаце зрабіць самастойна.

***— Магчыма, гэта звязана з тым, што ў мяне хворыя суставы і я прымаю гарманальныя прэпараты...***

— Так, кератомы могуць узнікаць на фоне гарманальнай тэрапіі.

***☎— Тамара, Мінск. Раней аналіз на палавыя інфекцыі я здавала ў дзяржаўным скурвендыспансэры на Прылуцкай. Зараз мой участковы гінеколаг параіла ісці ў адзін з прыватных цэнтраў, сказаўшы, што на Прылуцкай стала дорага...***

— Кошты сапраўды выраслі, бо наш дыспансэр закупіў новае сучаснае абсталяванне, якога пакуль у Мінску больш ні ў адным прыватным цэнтры няма. У нас сучасная ўстаноўка ПЦР, якая працуе ў рэжыме рэальнага часу, на тэставаных сістэмах, якія закупляюцца афіцыйна. У яе загружаецца прабірка, і камп'ютар выдае вынік — чалавечы фактар выключаны. На больш старым абсталяванні, якое выкарыстоўваецца ў многіх прыватных цэнтрах, чалавечы фактар выключыць не ўдаецца.

***☎— Вольга Паўлаўна, Мінск. Вельмі шмат радзімак на целе ў дачкі. Што з імі рабіць?***

— Радзімкі патрабуюць як мага менш умяшальніцтваў. Калі яны не траўмуюцца адзеннем ці бялізнай, то з імі нічога рабіць не трэба. Калі радзімкі знаходзяцца на твары і на адкрытых участках цела, прыносячы эстэтычны дыскамфорт, або на месцах, дзе траўмуюцца адзеннем ці падчас сну, то трэба іх убраць. Аднак выдаляюцца радзімкі толькі пасля кансультацыі анколага. Урач-анколаг вырашае, ці можна іх выдаляць і ў якіх умовах трэба гэта рабіць.

***— Яшчэ скажыце калі ласка, калі на руцэ белая пляма, напэўна, вітыліга называецца, з гэтым да вас звяртацца?***

— Гэта можа быць вітыліга, а можа быць дэпігментаваны нарост. Звяртацца найперш трэба да дэрматолагаў.

***☎— Ірына, Віцебскі раён. Пару дзён таму дзіця апаліла нагу прасам. Адразу мы ахалоджвалі апаленае месца, але пасля да ўрача не звярталіся. Што рабіць з апёкам, каб не засталося следу? Побач з апёкам — радзімая пляма...***

— З радзімай плямай нічога не здарыцца. Зараз ваша задача — зрабіць прафілактыку другаснай інфекцыі. Апёк будзе сам праходзіць, а вы можаце змазаць зялёнкай або, калі не падабаецца колер, растворам хлоргіксідзіну — ён у гатовым выглядзе прадаецца ў аптэках. Растворам хлоргіксідзіну скуру трэба апрацоўваць часцей, чым зялёнкай, — ад 2 да 5 разоў у дзень. Калі ёсць пухіры, то праз нейкі час, магчыма, ёсць сэнс іх разрэзаць. Каб пасля апёку не заставалася слядоў, калі сыдзе скарынка, можаце набыць крэм «Контрактубеск». Гэта прэпарат, які сябе добра зарэкамендаваў у барацьбе з рубцамі. Хоць звычайна апёкі ад праса неглыбокія і зажываюць без праблем.

***☎— Марына, Мінск. Нядаўна гінеколаг знайшла ў мяне папіломы. Я хачу зрабіць аналіз на папіломавірус. Сёння прыватныя цэнтры прапануюць некалькі відаў аналізаў на гэтую інфекцыю...***

— Сапраўды, шмат дзе можна зрабіць аналіз на гэты вірус, які мае шэраг штамаў, у тым ліку і анкагенных. У скурвендыспансэры яго робяць двума метадамі: якасны — ёсць вірус ці няма, і колькасны — калі ён ёсць і патрабуе лячэння або калі ён ёсць, але лячэння не патрабуе, бо імунная сістэма самастойна з ім спраўляецца. Ёсць у нас і магчымасць выяўлення анкагенных штамаў — тых, што вядуць, напрыклад, да раку шыйкі маткі. Пры наяўнасці паказанняў якасны метад робіцца ў нас бясплатна. Паказаннямі з'яўляецца тая ж эрозія шыйкі маткі з дысплазіяй 1,3, якая пацверджана цыталагічна. Калі ад гінеколага вы атрымаеце такі накірунак, то аналіз вам зробяць бясплатна.

***— Ці можна пазбавіцца ад папіломавіруса?***

— Спецыфічнага лячэння не існуе. Мы назіраем, прызначаем пэўнае лячэнне, але яно хутчэй агульнаўмацавальнае, накіраванае на ўзмацненне імуннай сістэмы. У выніку на кантролі мы часам дасягаем добрага выніку: вірус пры паўторных аналізах не «ловіцца».

### НА АДПАЧЫНКУ КАРЫСНА ПАМЯТАЦЬ

Калі наведваеце басейн ці грамадскую лазню, то пажадана карыстацца сваім абуткам, каб пазбегнуць грыбка. Калі вы карысталіся абуткам напракат, то пасля неабходна памыць ногі. Ёсць і медыкаментозная прафілактыка: супрацьгрыбковыя прэпараты ў выглядзе спрэяў, вадкасцяў прадаюцца ў аптэках — імі можна апрацаваць ногі.

У прафілактыцы інфекцый, якія перадаюцца палавым шляхам, нічога лепшага, чым прэзерватыў, пакуль не прыдумана. Ён застаецца сродкам абароны нумар адзін. Калі так атрымалася, што прэзерватыва ў патрэбны момант не аказалася, ёсць пункты экстраннай прафілактыкі. У Мінску ён размешчаны на базе скурвендыспансэра на Прылуцкай у прыёмным аддзяленні, працуе кругласутачна. Але туды па прафілактычную дапамогу пажадана прыязджаць у першыя гадзіну-дзве пасля неабароненага сэксу. Калі не атрымалася своечасова, можна звярнуцца на наступны дзень да ўрача-дэрматавенеролага. Вам парояць фармпрафілактыку.

***— Чула, што існуе вакцына супраць папіломавіруса. У якім узросце пажадана рабіць прышчэпку дзяўчынцы?***

— Прышчэпка павінна быць зроблена да кантакту з гэтым вірусам. Аптымальны варыянт — да пачатку палавога жыцця, гадоў у 12-14. Вакцына даволі дарагая. У нашай краіне, мяркую, такая прышчэпка ў бліжэйшыя гады будзе выконвацца на платнай аснове.

***☎— Ала, Мінск. Падзяліцеся, калі ласка, меркаваннем, наколькі шкодны для скуры салярый...***

— Пытанне, якое турбуе многіх, — яго пастаянна задаюць. Тут прынцып адзін: «Што занадта, то не здрова». У разумнай колькасці — калі ласка, але не трэба сядзець у ім круглы год, каб у любую пару хадзіць «у шакаладзе». Занадта шмат уздзеяння доўгай хвалі ўльтрафіялету не павінна быць. Зноў-такі розныя новаўтварэнні вельмі не любяць такое ўздзеянне.

***☎— Раіса Мікалаеўна, Полацкі раён. Наколькі небяспечным з'яўляецца купанне ў вадаёмах? Ці можна падхапіць якую-небудзь скурную інфекцыю, пакупаўшыся, скажам, у Заходняй Дзвіне?***

— Калі на пляжы ёсць таблічка «Купацца забаронена», то лепш не купацца. Праўда, нашы вадаёмы небяспечныя звычайна з-за наяўнасці ў іх кішэчнай палачкі. А гэта не скурнае захворванне. Са скурных на Нарачы можна падхапіць цэркарыёз — яго выклікаюць паразіты вадаплаўных птушак. Пакупаешся, а цела потым быццам бы пакусанае камарамі. Гэтая лічынка не з'яўляецца паразітам чалавека і ў чалавека не выжывае, але выклікае часовы зуд. Ён хутка праходзіць. Прафілактыка тут самая простая: пасля купання прымаць душ. Яшчэ адзін варыянт — на лодцы адплыць ад берага і купацца дзесьці на глыбіні: лічынкі жывуць на мелкаводдзі, дзе прагрэтая вада.

***☎— Валянціна, Мінск. У мяне ў спякоту на пальцах рук з'яўляюцца маленькія пухіркі, напоўненыя вадкасцю. Дыскамфорту яны не выклікаюць, але хацелася б даведацца, што з імі рабіць.***

— Тое, пра што вы кажаце, хутчэй за ўсё дысгідроз. Гэта не зусім паталогія, але парушэнне ёсць. Можна ўзяць любую гарманальную мазь, змяшаць яе ў роўнай прапорцыі з дзіцячым крэмам і мазаць у перыяды абвастрэння. Па магчымасці, не кантактаваць з бытавой хіміяй: яна можа правакаваць абвастрэнне. Старацца не мачыць рукі без неабходнасці. Прытрымлівацца дыеты. Харчаванне — гэта не першапрычына, але салёнае, кіслае, вострае можа падтрымліваць такі стан.

***— А як гэта звязана са спякотай?***

— Гэта звязана з узмоцненым потааддзяленнем, якое здараецца ў спякоту. Хоць і сама спякота для нашага арганізма — вялікі стрэс.

**«Прамую лінію» правялі Алена АЎЧЫННІКАВА і Вольга ШАЎКО.**


**Конкурсный управляющий КДУП «Сморгонский завод пищевых продуктов» — УП «ДжиЭс плюс» (www.gsplus.by) — ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 22.07.2011 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Скрыганова, 6/3, оф.2304 ОЧЕРЕДНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ АУКЦИОНА (на повышение начальной цены) по продаже имущества:**

**ЛОТ № 1 «СТО»**: Здание СТО – 265 кв.м, Ограждения, Водопроводная сеть, Линии электропередач, Асфальтированный подъезд.

**Начальная цена лота составляет 34 980 000 рублей, включая НДС по ставке 20 %. Задаток составляет 3 498 000 рублей. Шаг торгов составляет 3 498 000 рублей.**

**Лот № 2 «Нефтебаза»:** Емкость № 1, Емкость № 2, Емкость № 3, Емкость № 4, Емкость № 5, Здание склада ГСМ № 2 – 41 кв.м, Здание установки для мазутоснабжения – 82 кв.м, Здание мазутонасосной – 24 кв.м, Отстойник гидротранспортных вод – 2663 кв.м, Очистные сооружения дождевых вод – 139 кв., Ограждения, Пожарный резервуар №1, Пожарный резервуар №2, Мазутопровод, Ограждения, Линии электропередач, Железнодорожная ветка, Рампа.

**Начальная цена лота составляет 389 268 000 рублей, включая НДС по ставке 20 %. Задаток составляет 38 926 800 рублей. Шаг торгов составляет 19 463 400 рублей.**

**ЛОТ № 3 «Деревообработка»:** Навес для хранения сырья – 388 кв.м, Здание квасильно-засолочного пункта – 1 152 кв.м, Канализационная насосная станция № 2 – 40 кв.м. 208 560 000 рублей.

**Начальная цена лота составляет 208 560 000 рублей, включая НДС по ставке 20 %. Задаток составляет 20 856 000 рублей. Шаг торгов составляет 10 428 000 рублей.**

**Лот № 4 «Основное производство»:** Административное здание – 504 кв.м, Здание склада, карамельного цеха, сокового цеха – 1082 кв.м, Здание котельной – 880 кв.м, Здание склада готовой продукции сушильного цеха – 396 кв.м, Здание пристройки к сушильному цеху с навесом – 305 кв.м, Здание весовой 10 тонн – 55 кв.м, Здание насосной второго подъема – 194 кв.м, Здание канализационной насосной станции – 124 кв.м, Здание картофелехранилища № 5 – 2608 кв.м, Здание цеха сухого картофельного пюре – 4113 кв.м, Здание весовой 25 тонн – 109 кв.м, Здание теплицы – 262 кв.м, Здание консервного цеха – 1156 кв.м, Здание склада готовой продукции – 400 кв.м, Стеклотарный склад – 896 кв.м, Склад готовой продукции – 1003 кв.м, Здание гаража для машин – 314 кв.м, Здание кузницы – 11 кв.м, Здание насосной гидротранспортных вод – 30 кв. м., Канализационная сеть, Линии электропередач, Тепловые сети, Водопроводная сеть, Ограждения, Пожарный резервуар, Зеленые насаждения (плодоносящие яблони), Железнодорожная ветка, Рампа.

**Начальная цена лота составляет 1 906 344 000 рублей, включая НДС по ставке 20 %. Задаток составляет 190 634 400 рублей. Шаг торгов составляет 95 317 200 рублей.**

Все недвижимое имущество расположено в Гродненская обл., Сморгонский р-н, д. Солы, ул. Социалистическая, 54 на территории общей площадью 14 га. (5 километров от Сморгони, 15 километров от Островца). Через территорию проходит действующий участок железной дороги. Имеется электричество, водоснабжение и газовое отопление практически всех зданий.

В сети Интернет план застройки территории завода, имеющихся сетей, иной информации можно найти на: **http://gsplus.by/blocks/posts/130/**

Прием заявок происходит по адресу г. Минск, ул. Скрыганова, 6/3, оф. 2304 с даты настоящей публикации **до 21.07.2011 г. с 9.00 до 18.00**, здесь же ознакомление с составом лота и др. сведениями, формой заявки, договоров и др. документов. Тел. в г. Минск: 8(017) 2046870. Оплата задатка производится с даты настоящей публикации до 21.05.2011 г. на р/с КДУП «Сморгонский завод пищевых продуктов» № 3012205980013 в ОАО «Белагропромбанк» отд. в г. Сморгонь, код 460, УНП 590340550.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения имущества по сравнению с предложениями других участников. Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Победитель торгов в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи оплачивает цену за минусом внесенного задатка. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов. Способ уведомления участников об итогах торгов: в день торгов, публично.

В случае заявки одного участника на аукцион ему будет предложено приобрести выставляемый лот по начальной цене плюс 5 (пять) процентов.

ЛИКВИДАЦИОННАЯ КОМИССИЯ

**ЗАО «НПО «ЭЛЬВИРА»**

продает с торгов принадлежащую ЗАО «НПО «Эльвира» долю в уставном фонде Совместного общества с ограниченной собственностью «БАУМИТ-Бел» в размере 32% уставного фонда по цене 161 900 (сто шестьдесят одна тысяча девятьсот) евро.

Торги проводит ликвидационная комиссия ЗАО «НПО «Эльвира» 25 июня 2011 года, в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чернышевского, д. 8, комн. № 337. *УНП 100289025*

В предложении даты начала и окончания совершения сделок купли-продажи акций ОАО «Лукомльэнергомонтаж» (газета «Звязда» № 113 от 18.06.2011 г.) следует читать: с 30 июня 2011 г. по 30 декабря 2011 года.

Даты начала и окончания совершения сделок купли-продажи акций: с 25 июня 2011 г. по 31 декабря 2011 г. считать недействительными. *УНП 300007839*

Управляющий ООО «Тимпан» ООО «Брагинец и Партнеры» приглашает принять участие 30.06.2011 в торгах в форме открытого аукциона по продаже незавершенного строительством объекта по ул. З. Бядули, 13 в г. Минске. Извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Рэспубліка» от 04.06.2011. Подробная информация по тел.: (8 017) 227 74 77, (8 029) 376 33 78. *УНП 100307978*




Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## Доктар адкажа

### Калі перавозку ажыццяўляе бальніца...

**«У Мінскай абласной бальніцы бацьку зрабілі аперацыю з-за пераломy шыйкі сцягна. Жыве ён у Мачулішчах. Падкажыце, як нам яго завезці дадому?**

**Сяргей,** *г. Мінск***».**

**Намеснік галоўнага ўрача па медыцынскай часці 18-й гарадской паліклінікі г. Мінска Ірына ШЫЛОВІЧ:**

— Дастаўку пацыента ў стацыянар ажыццяўляе брыгада хуткай медыцынскай дапамогі па накіраванні ўрача, які робіць адпаведную адзнаку ў накіраванні і інфармуе службу 103 аб неабходнасці суправаджэння хворага ўрачом або фельчарам брыгады. Падчас выпіскі са стацыянара пацыента, які мае патрэбу ў транспартаванні ў становішчы лежачы, дастаўка дадому ажыццяўляецца транспартам бальніцы. Адпаведнае рашэнне прымаецца загадчыкам таго аддзялення, дзе лячыўся пацыент. Калі пасля завяршэння лячэння ў стацыянары пацыент можа быць транспартаваны ў становішчы седзячы, то дадому ён перавозіцца асабістым транспартам.

У сталіцы, згодна з рашэннем Мінгарвыканкама «Аб ходзе выканання мерапрыемстваў па стварэнні безбар'ернага асяроддзя ў г. Мінску» функцыянуе служба «сацыяльнае таксі». Спецыяльна абсталяваныя машыны перавозяць інвалідаў-калясачнікаў, інвалідаў па зроку, інвалідаў з парушэннем апорна-рухальнага апарату 1 і 2 груп. Заказ таксі ажыццяўляецца за 2-3 дні ў раённым тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Тэлефон для заказу сацыяльнага таксі ў Ленінскім раёне г. Мінска — 291 00 65.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

**«Калі я выязджаю на адпачынак, то заўсёды імкнуся браць з сабой як мага менш рэчаў, у тым ліку не бяру і лекі... Мае знаёмыя, дарэчы, гэтага не ўхваляюць і бяруць з сабой, як мінімум, што-небудзь ад расстройства страўніка, а я думаю, што ўсё сёння можна купіць на месцы... Якога меркавання тут трымаюцца ўрачы?**

**Валянціна,** *г. Віцебск***».**

### ЯКІЯ ЛЕКІ ЎЗЯЦЬ З САБОЙ?

**Валеолаг 23-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска Алена ГАРНІЦКАЯ:**

— Сапраўды, існуюць дакладныя рэкамендацыі адносна таго, як павінны паводзіць сябе тыя, хто выязджае за мяжу. Прынята гаварыць аб тым, што яшчэ да таго, як накіравацца ў падарожжа, варта падумаць, наколькі стан здароўя дазваляе вам наведаць тую ці іншую краіну з адпаведным кліматам, умовамі харчавання, асаблівасцямі культурнага адпачынку, магчымасцямі правядзення прафілактычных прышчэпак.

З асаблівай увагай варта ставіцца да рэкамендацый урача людзям з хранічнымі хваробамі, цяжарным, асобам з малымі дзецьмі і пажылым. Неабходна ведаць, у якіх краінах існуе рэальная пагроза заражэння асабліва небяспечнымі і паразітарнымі захворваннямі, для якіх характэрна цяжкае працяканне і сур'ёзныя наступствы для арганізма. Пацікаўцеся ў турфірме, якая забяспечвае вашу паездку, адносна наяўнасці такіх захворванняў у той краіне ці групе краін, якія вы маеце намер наведаць, а яшчэ лепш — самі азнаёмцеся з асаблівасцямі той ці іншай краіны, яе звычаямі, санітарна-эпідэміялагічнай сітуацыяй і г.д.

Перад паездкай рэкамендуецца сфарміраваць аптэчку першай дапамогі, якая зэканоміць час і сродкі на пошук лекаў. Туды павінны трапіць прэпараты антыбактэрыяльныя, абязбольвальныя, сардэчна-сасудзістыя, супрацьалергічныя, спазмалітыкі, страўнікавыя (смекта, актываваны вугаль), сродкі ад укусаў насякомых, перавязачны матэрыял, бактэрыцыдны пластыр, сонцаахоўны крэм.

**Загадчыца аддзялення асабліва небяспечных інфекцый Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Наталля МІНІНА:**

— Пры паездцы ў краіны, неспрыяльныя па жоўтай ліхаманцы, а гэта больш як 40 краін свету — пераважна краіны Афрыкі і Лацінскай Амерыкі, — неабходна абавязкова зрабіць прафілактычную прышчэпку і атрымаць міжнароднае пасведчанне аб вакцынацыі ў пункце прышчэпак гарадской паліклінікі №19 па адрасе: г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 119, тэл. 267 07 22. Прышчэпка робіцца бясплатна.

Пры жаданні за пэўны час да паездкі можна зрабіць і прышчэпку ад менінгакокавай інфекцыі, якая найбольш часта сустракаецца ў краінах Паўднёва-Усходняй Азіі, Саудаўскай Аравіі.

Выязджаючы на працяглы час у краіны, неспрыяльныя па малярыі (Паўднёва-Усходнюю Азію, Афрыку, Лацінскую Амерыку) неабходна атрымаць рэкамендацыі ўрача аб прафілактычных лекавых прэпаратах і спосабах іх прымянення. На жаль, прышчэпкі ад малярыі не існуе, аднак уратаваць ад непрыемнасцяў павінны элементарныя правілы засцярогі. Неабходна карыстацца рэпелентамі, насіць адзенне з доўгімі рукавамі — словам, рабіць усё, каб пазбегнуць укусаў камароў.

У цэлым жа трэба мець на ўвазе, што ў першы дзень прыезду ў іншую краіну вы можаце адчуваць сябе не лепшым чынам — гэта нармальна, паколькі арганізм павінен адаптавацца да новых кліматычных умоў. У наступныя дні самай важнай задачай будзе прадухіленне заражэння кішэчнымі інфекцыямі. Ніколі не харчуйцеся на бягу — толькі там, дзе ёсць сэрвіснае абслугоўванне. Насцярожанасць у дачыненні да вады павінна быць асаблівай. Мы не раім нават проста мачыць рукі ў фантане...

Калі па вяртанні дадому ў вас з'явілася павышаная тэмпература і вы дрэнна сябе адчуваеце, неабходна тэрмінова звярнуцца да ўрача і паведаміць яму аб тым, што вы толькі што вярнуліся са спякотнай краіны або іншай замежнай паездкі.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

#### Парады для тых, хто адпачывае за мяжой:

У час паездкі ў любую замежную краіну неабходна самому клапаціцца аб сваім здароўі і прытрымлівацца пэўных санітарна-гігіенічных і бытавых правілаў.

- Карыстацца гатаванай або бутыляванай вадой: для піцця, чысткі зубоў, мыцця фруктаў і г.д.
- Мыць рукі як мага часцей і абавязкова — перад ежай.
- Ужываць тэрмічна апрацаваную ежу з рэстаранаў, рэкамендаваных турыстычнай кампаніяй.
- Пазбягаць траплення вады ў поласць рота пры купанні ў басейнах ці на моры.
- Не хадзіць басанож па незнаёмай мясцовасці з раслiннасцю.
- Карыстацца рэпелентамі і іншымі сродкамі абароны ад камароў і іншых насякомых.
- Пазбягаць кантакту з жывёламі, хатняй і дзікай птушкай.

Краіна здароўя

Выпуск № 33 (269)

Што рабіць?

## КАБ КАМАРЫ НЕ САПСАВАЛІ АДПАЧЫНАК...

**ЦЁПЛЫ летні вечар, выхадны. Непадалёк ад дома з тэрасай дыміць мангал, але гаспадары з гасцямі ўжо не радуюцца ідэі правесці пікнік на адкрытым паветры. Прычына празаічная — камары, якіх, відаць, год ад года становіцца ўсё больш.**

Для таго, каб размнажацца, камарам дастаткова невялікай колькасці вады. Возера, балота, сажалка, ды і проста бочка з вадой — гэтага ўжо хопіць. Нават звычайная лужына можа быць выдатнай «базай» для камароў. Другая крыніца — гарадскія недагледжаныя падвалы. Калі домакіраўніцтва або таварыства ўласнікаў кватэр не падтрымлівае падвалы ў парадку, камары там могуць размнажацца круглы год і пранікаць у дамы праз вентыляцыйныя люкі.

Кроў смокча толькі самка камара. Бялок, які змяшчаецца ў крыві чалавека або жывёлы, патрэбен ёй для размнажэння. Ад яго залежыць і колькасць патомства: самка, якая не зможа насмактацца дастаткова крыві ў шлюбны перыяд, адкладзе ўсяго адну невялікую кладку яек.

Калі ў паветры скача рой дробных камарыкаў, не бойцеся: гэта самцы, якія чакаюць вяселля, яны не кусаюцца. Вялікіх камароў, якіх многія чамусьці завуць «малярыйнымі», таксама баяцца не варта — гэта даўганожкі, яны вегетарыянцы.

Ідэальная тэмпература для камара — +16 градусаў, адносная вільготнасць — 80—90%. Камары перастаюць атакаваць пры тэмпературы вышэй +28, у сухім паветры гудлівая эскадрылля не трымаецца — страчвае ваду. Не любяць «крывапіўцы» і вышынных палётаў.

Пры выбары ахвяры самка крывасмока арыентуецца на вуглякіслы газ, які выдыхае чалавек (радыус выяўлення да 12 метраў), на цеплавое выпраменьванне, рухі, а таксама на пах малочнай кіслаты, якая ёсць у поце. Таксама самка камара рэагуе на святло, выбіраючы слаба асветленыя памяшканні, з-за чаго ў гарадскіх кватэрах яны вядуць у асноўным начны лад жыцця.

Насуперак распаўсюджанай памылковай думцы, камароў не адпуджвае сам па сабе драўняны дым; адносны поспех працэдуры «выкурвання» тлумачыцца цеплавым выпраменьваннем крыніцы дыму, якое ўносіць перашкоды ў работу іх цеплалакатара. Менавіта таму камары менш актыўныя на фоне магутных крыніц цяпла (вогнішча, печка).

Джала камара, падобнае на іголку шпрыца, абаронена спецыяльным чахлом, які падчас праколвання скуры ссоўваецца назад. Перш чым самка пачынае смактаць кроў, яна ўводзіць пад скуру антыкаагулянт, які не дазваляе згусаць крыві і дае магчымасць удосталь ёй напіцца. Дарэчы, менавіта гэтае рэчыва выклікае сверб, ацёк, пачырваненне на месцы ўкусу, а ў некаторых выпадках і цяжкую алергічную рэакцыю.

### Што ж можна супрацьпаставіць камарам?

Чалавецтва выкарыстоўвае ўвесь арсенал цывілізацыі для барацьбы з камарамі: антымаскітныя сеткі, рэпеленты, фумiганты, спіралі, мазі, народныя сродкі.

- Рэпеленты ў цэлым дастаткова эфектыўныя, прычым сінтэтычныя валодаюць больш магутным і працяглым дзеяннем. Іх дастаткова нанесці на скуру адзін раз, і абарона ад камароў забяспечана на некалькі гадзін. Рэпеленты, як правіла, выпускаюцца ў выглядзе крэмаў, эмульсій, ласьёнаў-спрэяў і нават алоўкаў. Ёсць сродкі для дарослых, дзяцей і малых (ад трох гадоў). Час ахоўнага дзеяння рэпеленту, нанесенага на скуру, можа зменшыцца, калі вы мыліся або плавалі. Пасля інтэнсіўнай фізічнай нагрузкі ахоўнае пакрыццё змываецца з потам, часткова сціраецца або ўсмоктваецца ў скуру. Высокая тэмпература і вільготнасць паветра, вецер таксама могуць скараціць дзеянне рэпелентаў.

У рэпелентаў, на жаль, ёсць і мінусы: яны супрацьпаказаны цяжарным жанчынам, людзям з захворваннямі скуры, спецыялісты не рэкамендуюць іх выкарыстоўваць дзецям да 5—8 гадоў. Іх нельга наносіць на пашкоджаную скуру (ранкі, драпіны), непажадана пападанне на слізістыя абалонкі рота і носа, у вочы.

- Піратэхнічныя фумігатары для выкарыстання на прыродзе (спіралі і сцікі) — для тых, хто збіраецца ў паход, на рыбалку, пікнік. Абгарадзіце імі месца сваёй стаянкі, і вы на нейкі час у бяспецы. Дзейнічаюць спіралі і сцікі накшталт кітайскіх палачак — тлеюць, выдзяляючы згубныя для насякомых пары. Мінусы: дым і залежнасць ад кірунку ветру. У якасці альтэрнатывы спіралям можна парэкамендаваць спецыяльныя выпарнікі супраць камароў з прыемным, у асноўным лімонным, водарам.
- У барацьбе з камарамі прымяняюцца і прыстасаванні, якія імітуюць і значна ўзмацняюць гук, што выдаюць камары-самцы для прыцягнення самак. Для аплодненай самкі гэты гук невыносны. Яна адлятае ад яго крыніцы як мага далей.

### Народныя сродкі

Абараняцца ад насякомых можна і без хіміі. Камары вельмі адчувальныя да пахаў. Вядома, што яны не пераносяць паху *таматнага лісця* і, адчуўшы яго, знікаюць. Пастаўце некалькі гаршкоў з таматнымі кустамі ў доме або перад вокнамі — гэта надзейны бар'ер супраць камароў.

Камары не любяць таксама паху *гваздзікі, анісу і эўкаліпту*. Намачыце алеем гэтых раслін ватку і пакладзіце на падаконнік. Можна таксама намазаць гваздзіковым, анісавым або эўкаліптавым алеем агаленыя часткі цела.

Адпуджваюць камароў і пах *валяр'яну, тытунёвы дым і дым ад злёгку прасушанай ігліцы ядлоўцу, хваёвых або яловых шышак, камфары*. Сто грамаў камфары, што выпарваюцца над гарэлкай, пазбавяць ад мух і камароў нават вельмі вялікія памяшканні.

Ад свербу пасля ўкусу камара (авадня, мошкі) можна пазбавіцца, прыклаўшы да пашкоджанага месца расцёртую мяту, мацярдушку, мелісу, трыпутнік, святаяннік, дольку лімона, кветку чаромхі альбо ватку, змочаную нашатырным спіртам. Калі сверб і ацёк не праходзяць, накладзіце кампрэс з раствору соды і прыміце таблетку любога антыгістаміннага прэпарата.

**Эфектыўныя і наступныя народныя сродкі:**

- Змяшаць кашку часнаку напалам з мёдам, намазаць гэтай сумессю складзеную ў 2 столкі марлю і прыкласці яе да месца ўкусу, замацаваўшы бінтам. Павязку мяняць 2 разы на суткі да знікнення болевых адчуванняў.
- Надзерці палову галоўкі рэпчатай цыбулі, пакласці цыбульную кашку ў марлю, адціснуць сок і змазваць гэтым сокам месца ўкусу.
- Перыядычна прыкладваць да месца ўкусу кавалачкі сырой бульбы або лісце пятрушкі.
- Заліць 3 ст. лыжкі сухіх суквеццяў піжмы шклянкай гарачай вады, кіпяціць 15 хвілін, затым працадзіць і рабіць прымочкі.

### Калі вас укусіла пчала...

Найбольш небяспечныя ўкусы слізістай абалонкі рота, бо ў гэтым выпадку могуць развіцца ацёкі зева і гартані, што выкліча ўдушша.

Зразумела, пчала не можа заляцець у закрыты рот. Малаверагодна і тое, што хто-небудзь пачне знарок адкрываць рот, каб яна туды заляцела. Як правіла, пчала можа трапіць да вас у рот адзіным спосабам: плаваючы на паверхні вады, соку, квасу або іншай вадкасці, якая захоўваецца ў незакрытай пасудзіне, з якой вы вырашыце папіць. Таму выснова: не пакідайце ёмістасці з ахаладжальнымі напоямі адкрытымі, абавязкова накрывайце іх накрыўкай або марляй.

Пчолы рэдка нападаюць на чалавека ўдалечыні ад вулляў, калі ён іх не чапае. Затое калі падысці блізка да пчальніка, у пчол спрацоўвае інстынкт самазахавання, і тады яны, абараняючы сваё жыллё, могуць наляцець на чалавека цэлым роем. Таму не варта на шкоду сабе парушаць спакой пчаліных сем'яў.

Калі ўсё-ткі пчалінага ўкусу не ўдалося пазбегнуць, як мага хутчэй выдаліце джала з ранкі іголкай, папярэдне прадэзынфікаваўшы яе, пратрыце ранку спіртам і прыкладзіце да пашкоджанага месца холад (кавалак лёду з маразільнай камеры або бутэльку з халоднай вадой). Можна выпіць таблетку антыгістаміннага прэпарата. Гэтая мера таксама з'яўляецца прафілактыкай і лячэннем алергічнай рэакцыі.



**УВАГА!** Калі след ад укусу не падобны на ўжо знаёмыя вам сляды ад укусаў камароў ці аваднёў або вы заўважылі сур'ёзнае пагаршэнне самаадчування (цяжка дыхаць, кружыцца галава, з'явілася млоснасць і да т.п.), а таксама пры множных укусах з наступнай таксічнай рэакцыяй — абавязкова звярніцеся да доктара!

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**


**СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!**

**ПАДПІСКА НА 2-Е ПАЎГОДДЗЕ 2011 ГОДА**

***Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)***

| Індэкс | месяц | I квартал | паўгоддзе |
|---|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 14600 | 43800 | 87600 |
| 63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў) | 13400 | 40200 | 80400 |
| 63858 (ведамасны) | 24800 | 74400 | 148800 |
| 63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры) | 22200 | 66600 | 133200 |

***Падпіска «Да запатрабавання» праз кіёскі РУП «Белпошта»***

| Індэкс | месяц | I квартал | паўгоддзе |
|---|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 13350 | 40050 | 80100 |
| 63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў) | 12150 | 36450 | 72900 |
| 63858 (ведамасны) | 22511 | 67533 | 135066 |
| 63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры) | 20140 | 60420 | 120840 |

***Падпіска «Да запатрабавання» праз кіёскі РУП «Белсаюздрук»***

| Індэкс | месяц | I квартал | паўгоддзе |
|---|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 13250 | 39750 | 79500 |
| 63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў) | 12120 | 36360 | 72720 |
| 63858 (ведамасны) | 19591 | 58773 | 117546 |
| 63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры) | 18063 | 54189 | 108378 |

***Заставайцеся з намі!***

# У крэпасць паклікала памяць...

*Каля пяці тысяч чалавек сабралася ў Брэсцкай крэпасці задоўга да світання 22 чэрвеня. Сюды прыйшлі не толькі гараджане, але і ўдзельнікі 43 дэлегацый з самых розных краін свету. Замежныя госці знарок прыехалі ў Брэст, каб сустрэць 70-ю гадавіну пачатку вайны там, дзе яна пачалася.*


Фота БЕЛТА.

На гэты раз мерапрыемствы распачаліся не ў чатыры гадзіны раніцы, а значна раней. Прафесійныя і самадзейныя артысты падрыхтавалі мастацкую праграму — рэканструкцыю вечара напярэдадні вайны. Каб усё было як тады, як у вядомай песні Кабзона: «А за окном, за окном красота новолунья, Шепчутся с Бугом плакучие ивы. Год сорок первый, начало июня. Все еще живы, все еще живы».

Толькі музыка там гучала не сучасная, а тая, якую любілі ў 40-я гады. І танцы ў парку ледзь не да раніцы, і радасныя спатканні, і шчаслівыя пацалункі, і абавязкова фільм «Валерый Чкалаў» у кінатэатры. А палітрук, што запрашае на танец нявесту, не ведае, што жыць яму засталося роўна да світання... Усю гэтую ідылію даваеннага правінцыйнага горада перарывае выццё сірэны, сусветны грукат і суцэльныя ўзрывы. Так пачыналася вайна.

А роўна ў чатыры гадзіны на плошчы Цырыманіялаў ля Вечнага агню аб'явілі традыцыйны мітынг, прысвечаны светлай памяці тых, хто загінуў, і ў гонар тых, хто дайшоў да перамогі. Мітынг быў непрацяглы, колькі слоў сказалі губернатар, ветэран, вучаніца. І зноў паплылі вянкі па Бугу ў памяць аб салдатах, якія палілі крывёю ваду, і ў гонар самой ракі, якая ўсё ж не дала загінуць хоць частцы мужных абаронцаў. Яны трымаліся больш за месяц, бо з цяжкасцю, з ахвярамі, але здабывалі выратавальную ваду.

Пасля мітынгу мастацкая праграма працягвалася. На гэты раз артысты паказалі першы дзень абароны ўсходняга форта Брэсцкай крэпасці. І прадстаўленне нагадала фільм «Брэсцкая крэпасць», прэм'ера якога адбылася роўна год таму на гэтым месцы.

А вечарам 22 чэрвеня адбылося ўрачыстае адкрыццё помніка «Героям мяжы, жанчынам і дзецям, якія сваёй мужнасцю зрабілі крок да неўміручасці». Помнік стаіць на месцы былой 9-й пагранзаставы, якой камандаваў Андрэй Кіжаватаў. У першы дзень вайны лейтэнант Кіжаватаў арганізаваў абарону аднаго з участкаў Брэсцкай крэпасці. Разам з падначаленымі байцамі ён адбіў шэсць варожых атак. А ў ноч на 23 чэрвеня Кіжаватаў перавёў сваіх пагранічнікаў у падвалы крэпасці. Ён працягваў ваяваць нават цяжка паранены. І загінуў смерцю героя. Праз 20 гадоў пасля Перамогі Андрэю Мітрафанавічу Кіжаватаву было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза пасмяротна. Але зорку героя не было каму атрымаць. Восенню 1942 года яго сям'я: маці, жонка, 15-гадовая дачка, 11-гадовы сын, 2-гадовая дачушка былі расстраляны каля вёскі Лешніца Маларыцкага раёна, дзе да гэтага хаваліся. Іх забілі за тое, што іх родны чалавек быў афіцэрам і сумленна выконваў свой абавязак.

Таму на скульптурнай кампазіцыі Валянціна Занковіча ёсць не толькі ваяры-абаронцы, але і жанчына, і дзеці. Варта адзначыць, што ідэя ўвекавечання памяці вартавых мяжы, іх жонак і дзяцей належыць кіраўніцтву Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Беларусі на чале з Ігарам Рачкоўскім. Сродкі на помнік таксама збіралі пагранічнікі, ветэраны службы, арганізацыі і ўстановы краіны. І вось ён заняў сваё месца на п'едэстале.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Радавыя Перамогі

# УДАВА ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ



**Даўно хацеў праз газетныя старонкі расказаць пра сваю маці Вольгу Ларчанку (дзявочае прозвішча Шпакава). Яна рана засталася без бацькі — той загінуў у час навальніцы (маланка ўдарыла ў дуб, пад якім мужчына хаваўся ад дажджу).**

У 1929 годзе ў васямнаццацігадовым узросце Вольга выходзіць замуж за Івана Ларчанку. Маладыя людзі адразу прынялі калектывізацыю і ўступілі ў калгас. Але мясцовае кіраўніцтва груба ставілася да сваіх работнікаў. Так, вясной 1940 года ў нашай каровы нарадзілася цялушка, якую бацькі вырашылі вырасціць на замену старой карове. Але калгасныя ўлады, не лічыліся з тым, што ў Ларчанкаў сямёра малых дзяцей, прымусілі цялушку здаць у калгас.

Далей была вайна. Тату не паспелі прызваць на фронт. Летам 1941-га ў зямлянцы бацькі хавалі і кармілі двух чырвонаармейцаў, пакуль тыя не перайшлі ў лес да партызан. У нашай хаце партызаны атрымлівалі інфармацыю аб перасоўванні немцаў. Па падазрэнні ў сувязях з партызанамі бацька быў схоплены і адпраўлены ў канцлагер, адкуль яму ўдалося збегчы. З верасня 1943 года ён ваяваў у 1158-м стралковым палку наводчыкам узвода супрацьтанкавых ружжаў. З фронту ён пісаў лісты, у якіх прасіў жонку, каб берагла дзяцей, але ў ліхалецце тры дзяўчынкі памерлі.

Асабліва Іван Ларчанка вылучыўся ва Усходняй Прусіі. 5 лютага 1945 года з супрацьтанкавага ружжа ён знішчыў 2 варожыя кулямётныя кропкі і пашкодзіў самаходку, а калі закончыліся боепрыпасы страляў з аўтамата. Можна пералічваць і іншыя эпізоды, якія пазначаны ва ўзнагародных лістах. Але атрымаць ордэны Славы II і III ступеняў Іван Ларчанка не паспеў... У канцы красавіка 1945 года маці атрымала пахавальную, у якой гаварылася, што яе муж гераічна загінуў у баі. Маці рвала на сабе валасы, не верыла, што бацька чатырох дзяцей, якія перажылі вайну, загінуў. Многа гадоў яго чакала. Ёй тады было няпоўных 32 гады...

Хату немцы спалілі пры адступленні. Жылі мы ў суседзяў, спалі ўпяцёх упоперак на паламаным ложку. Толькі праз 2 гады талакой з дапамогай мужыкоў-старых у вёсцы Быстрыца пабудавалі невялікі дом. За мужа на чатырох дзяцей Вольга Ларчанка атрымлівала мізэрную пенсію ў 72 рублі ў дарэформенных на той час грошах. Другой дапамогі ці льгот не было. Памятаю толькі адзін раз у Касмыніцкім сельсавеце маці далі 2 банкі фасолі ў таматным соусе, казалі — што даслалі з ЗША. А вось падаткі бралі нават за градкі ў агародзе. Дзятве даводзілася збіраць басанож гнілую бульбу з-пад снегу. Елі крапіву, шчаўе, лебяду, ліпавыя кветкі. Голад дапаўняла галеча: ні адзення, ні вопраткі.

У пасляваенным калгасе коней было мала, тэхнікі для апрацоўкі зямлі не было, даводзілася калгаснікам капаць зямлю рыдлёўкамі. На прысядзібных надзелах запрагаліся ў плуг усёй сям'ёй.

Маці даводзілася працаваць на калгасных фермах даяркай, свінаркай, на палявых працах араць, касіць, уручную сярпом убіраць ураджай зерневых. На адзін працадзень давалі 150-200 грамаў зерня, а было, што і нічога не давалі.

Сёння я — Уладзімір Ларчанка — з'яўляюся намеснікам старшыні савета ветэранскай арганізацыі. Доўгія гады па просьбе маці займаўся ўстанаўленнем воінскага шляху бацькі. Так стала вядома пра яго баявыя ўзнагароды і пахаванне ў брацкай магіле, што знаходзіцца ў Калінінградскай вобласці. Разам з маці двойчы ездзілі туды. На ўстаноўленым на магіле помніку ўбачылі і прозвішча бацькі. Усклалі кветкі, паплакалі.

Калі б былі жывыя сёння мае бацькі, яны, безумоўна, радаваліся б таму, што іх род не спыніўся. Шэсць унукаў, дзесяць праўнукаў, сярод якіх ёсць урачы, юрысты і прадстаўнікі іншых прафесій, годна прадстаўляюць наш род, прозвішча і Радзіму.

**Уладзімір ЛАРЧАНКА.**

# УЗНАВІЦЬ ПРЫШЧЭПКУ АД ФАШЫЗМУ

## Урокі Вялікай Айчыннай абмеркавалі навукоўцы і грамадскія дзеячы з нашай рэспублікі і дзесяці краін свету ў Брэсце

**За дзень да 70-годдзя пачатку вайны ў горадзе, які першым адчуў на сабе фашысцкую навалу, сабраліся вядомыя вучоныя, грамадскія дзеячы з Беларусі, Расіі, Украіны, Латвіі, Літвы, Чэхіі, Польшчы, Германіі, ЗША, Ізраіля, Францыі, каб у навуковай дыскусіі яшчэ на крок наблізіцца да праўды аб мінулай вайне. Канферэнцыю назвалі: «1941 год: трагедыя, гераізм, памяць». Але, відавочна, гэтымі словамі не вычарпаны ўсе тэмы абмеркаванняў, дыскусій, «круглых сталоў», змешчаных у рамкі форуму. Некаторыя ўдзельнікі прывезлі даклады, што падрабязна разглядаюць нейкі асобны аспект трагедыі альбо гераізму, але ўсе яны разам здольны сфармуляваць агульначалавечую ацэнку падзей 70-гадовай даўніны, каб яна стала напамінам нашчадкам.**




А вось таму, як захаваць памяць, як карыстацца ўрокамі вайны, можна вучыцца ў нас, беларусаў. Пра гэта гаварылі многія ўдзельнікі мерапрыемства. Як заўважыў у сваім вітальным слове **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін СУМАР**: «Роўна 15 гадоў таму дзень 22 чэрвеня стаў у нашай краіне агульнанацыянальным днём памяці і жалобы. Таму мы з разуменнем падтрымалі ініцыятыву Брэсцкага ўніверсітэта і грамадскага аб'яднання па вывучэнні знешняй палітыкі і бяспекі Рэспублікі Беларусь па правядзенні канферэнцыі, каб яшчэ раз прыцягнуць увагу ў тым ліку сусветнай грамадскасці да пытання аб праўдзівай інтэрпрэтацыі гістарычных падзей. Пачасціліся выпадкі непаважлівага стаўлення да ветэранаў-вызваліцеляў, адкрытай спекуляцыі гістарычнай праўдай аб ролі СССР і іншых краін на шляху да Перамогі. Да таго ж і ў XXI стагоддзі некаторыя палітычныя сілы разглядаюць вайну як сродак для дасягнення сваіх мэтаў. А гэта злачынства перад чалавецтвам. Таму вельмі важна сёння гаварыць маладому пакаленню праўду пра вайну. А ваш высокі навуковы патэнцыял дазваляе спадзявацца, што канферэнцыя стане яшчэ адным крокам для спасцікання і ўсведамлення гістарычнай справядлівасці». У працяг гэтай думкі адзін з арганізатараў форуму **рэктар Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Пушкіна Мечыслаў ЧАСНОЎСКІ** прывёў нават выказванне Эмануіла Канта, які сцвярджаў, што калі знікае справядлівасць, не застаецца нічога, што магло б прыдаць каштоўнасць жыццю. Вельмі вобразна ахарактарызаваў месца правядзення навуковага форуму другі арганізатар канферэнцыі — **дырэктар Цэнтра вывучэння знешняй палітыкі і бяспекі Рэспублікі Беларусь Сяргей ПАЛАГІН**: «Чалавеку ўласціва імкнуцца туды, дзе адбываліся значныя падзеі. Так, праваслаўнаму хрысціяніну здорава аказацца на Вялікдзень у Іерусаліме, а на Раство — у Віфлееме. А таму, хто шануе памяць пра вайну, 22 чэрвеня трэба быць у Брэсце, каб пайсці ў крэпасць у чатыры раніцы і адчуць сваё дачыненне да вялікага, як адчувае хрысціянін у Віфлееме. Усе мы тут для таго, каб разам шукаць шляхі да немагчымасці паўтарэння фашызму, нацызму ні ў якім выглядзе».

Удзельнікі канферэнцыі ў перапынку форуму падзяліліся сваімі думкамі з карэспандэнтам «Звязды». **Франц МАСЭР, старшыня міжнароднай грамадскай арганізацыі ў Германіі, былы начальнік паліцыі ў Гамбургу:**

— Я вельмі шкадую, што немцы развязалі гэту вайну. Мая сям'я на сабе адчула трагедыю. Мой брат ва ўзросце 18 гадоў ваяваў на ўсходнім фронце роўна месяц і адзін дзень... і загінуў. Абавязак кожнага свядомага еўрапейца — рабіць Еўропу месцам міру і спакою. І Брэст у гэтым сэнсе сімвалічны горад для Еўропы. Я даўно заняўся вывучэннем гісторыі і прыйшоў да высновы, што з часоў Магдэбургскага права мы з вамі ўсе — еўрапейцы. Таму разам павінны імкнуцца да захавання міру ў Еўропе. А ў Брэст трэба вазіць дзяцей новага пакалення з нашай, іншых краін, каб на руінах крэпасці расказваць ім праўду.


Франц Масэр.

**Архімандрыт ГАЎРЫІЛ, настаяцель скіта прападобных Антонія і Феадосія ў мястэчку Адрынкі (Польшча):**

— Вайна — гэта стан супраціўны чалавечаму існаванню. Хрыстос нам пакінуў мірную зямлю, якую мы павінны ў міры і падтрымліваць. А ў людзей, асабліва некаторых прадстаўнікоў маладога пакалення, пад уплывам пэўных сродкаў прапаганды фарміруецца няправільнае светаўспрыманне, псіхалагічнае прыняцце вайны як з'явы. Гэта няправільна, гэта трэба любым чынам выкараняць з душаў. І адным са шляхоў з'яўляецца захаванне памяці. А ў нас, на жаль, допускаюцца выпадкі, калі бураць помнікі, знішчаюць памятныя знакі пра падзеі ваенных гадоў. Так быць не павінна. Мы прыехалі, каб абмяняцца думкамі наконт сродкаў лекавання чалавечай душы і складніка гэтай душы — памяці.


Архімандрыт Гаўрыіл.

**Ангеле АМБРАЗЕНЕ, выкладчык гісторыі і паліталогіі (Літва):**

— Па-першае, я рада, што зноў трапіла ў Брэсцкую крэпасць. Была тут многа гадоў таму са сваімі дзецьмі. На нас расповед экскурсавода зрабіў вялікае ўражанне. Маленькі гарнізон трымаўся болей, чым уся Францыя. А немцаў тут палягло столькі, колькі да гэтага з пачатку развязанай імі вайны ва ўсёй Еўропе. І вось я зноў тут, на гэты раз як гісторык. Зараз у вас адкрываецца шмат архіваў. Таму я спадзяюся атрымаць шмат карыснай інфармацыі, каб данесці яе да сваіх слухачоў. Я вяду секцыю настаўнікаў гісторыі і паліталогіі краіны.


Ангеле Амбразене.

**Сяргей ПАТАПКІН, адзін з кіраўнікоў дэмакратычнай партыі Латвіі «Згода»:**

— На жаль, даводзіцца канстатаваць, што дзеянне прышчэпкі ад фашызму і нацызму, якую атрымала чалавецтва ў ходзе Другой сусветнай вайны, пачынае значна слабець. Таму мы і бачым, што бачым: малойчыкі са свастыкай вольна крочаць па вуліцы, помнікі героям-вызваліцелям бураць і выкідаюць на сметнік, а дзе-нідзе адкрыта абражаюць ветэранаў. Гэта значыць, што ўрокі вайны забываюцца, маладыя не ведаюць таго, што проста абавязаны ведаць цывілізаваны чалавек. А так быць не павінна. Таму мы і сабраліся, каб зверыць шляхі пераадолення гістарычнага вандалізму.


Сяргей Патапкін.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**

## АЎТАПРАБЕГ ПАМЯЦІ

**Аўтамабілісты-аматары і байкеры з Расіі і Беларусі ў памяць аб пачатку Вялікай Айчыннай вайны арганізавалі міжнародны аўтапрабег.**

Ён распачаўся ў Санкт-Пецярбургу і сімвалічна завяршыўся 22 чэрвеня, роўна ў 4 гадзіны раніцы, у Брэсце. Там была перададзена капсула з зямлёй з гарадоў-герояў былога СССР. Апошнія раней наведвалі ўдзельнікі аўтапрабегу.

Як паведаміў «Звяздзе» старшыня грамадскага аб'яднання «Браты-славяне» Сяргей Харланцьеў (Санкт-Пецярбург), удзельнікі народнай ініцыятывы «Адна краіна — адна Перамога» на сваім шляху заязджалі ў Хатынь, аддалі даніну памяці і на Кургане Славы. Ускладвалі кветкі да манументаў і мемарыялаў, дзякавалі за перамогу ветэранам.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# УСТАНОЎЛЕНА ЯШЧЭ 15 ІМЁНАЎ АХВЯРАЎ ВАЙНЫ

**ВІКТАР ШУМСКІ, начальнік упраўлення па ўвекавечванні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяраў войнаў Узброеных сіл Міністэрства абароны, паведаміў на прэс-канферэнцыі, што сёлета знойдзена 87 астанкаў ваеннаслужачых РККА, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. З іх устаноўлена ўжо 15 імёнаў. У параўнанні з папярэднімі гадамі — гэта вельмі шмат.**

— У нас ёсць шанц устанавіць яшчэ 55 імёнаў, — распавядае Віктар Віктаравіч. — У Віцебскай вобласці было знойдзена пахаванне танкістаў 2-ой танкавай брыгады 1943 года, звесткі пра якое ёсць у аўтаматызаванай базе звестак «Мемарыял». Астанкаў знойдзена менш, але высветлена, што гэта менавіта тое захаванне.

Таксама Віктар Шумскі паведаміў, што ў снежні мінулага года была зацверджана дзяржаўная праграма па ўвекавечванні памяці абаронцаў Айчыны на 2011—2014 гг. Гэтая праграма прадугледжвае ў тым ліку комплекс мерапрыемстваў па святкаванні 70-годдзя пачатку ВАВ, 200-годдзя пачатку Айчыннай вайны 1812 года і 100-годдзя пачатку Першай сусветнай вайны. Нягледзячы на эканамічныя складанасці, дзяржавай было прынята рашэнне не скарачаць фінансаванне Праграмы па ўвакавечванні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяраў войнаў на 2011—2014 гг. Плануецца, што з рэспубліканскага бюджэту будзе вылучана 117 млн рублёў, з мясцовых бюджэтаў —1 млрд 737 млн руб.

З сакавіка гэтага года былі зацверджаны планы рэкагнасцыроўкі пошукавых аб'ектаў і правядзення палявых пошукавых работ, якія прадугледжваюць работы на 106 асноўных і 2 дадатковых пошукавых аб'ектах на тэрыторыі 47 раёнаў усіх абласцей Беларусі. Таксама мяркуецца правядзенне зандзіравання мясцовасці на 2 пошукавых аб'ектах на тэрыторыі Падляскага ваяводства Польшчы. У ліпені 2011 года адбудзецца перазахаванне астанкаў 15 савецкіх салдат у горадзе Гайнаўка Падляскага ваяводства, якія загінулі ў чэрвені 1941 года ў Беластоцкім выступе. Іх астанкі былі знойдзены спецыялістамі 52-га асобнага спецыялізаванага вайсковага батальёна падчас зандзіравання мясцовасці ў кастрычніку 2010 года.

— Мы ўжо праводзілі адно падобнае перазахаванне, — распавядае Віктар Шумскі. — У пазамінулым годзе былі перазахаваны астанкі 16 савецкіх салдат, знойдзеныя на тэрыторыі Падляскага ваяводства. Сёлета на тэрыторыі могілак, на якіх пахаваныя ў асноўным вайскоўцы, што загінулі падчас вызвалення Польшчы, з'явіцца 4 магілы, дзе будзе пахаваны 31 савецкі салдат. Усе яны загінулі ў чэрвені 1941 года ў Беластоцкім выступе. Для нас гэта мае асаблівае значэнне, таму што большасць безыменных магіл звязана менавіта з трагічнымі днямі чэрвеня 1941 года.

Падчас пошукавага перыяду 2011 года запланавана правядзенне сумесных палявых работ ці ваенна-патрыятычных акцый з прадстаўнікамі вайсковых грамадскіх аб'яднанняў Чалябінскай, Маскоўскай, Ніжагародскай і Пензенскай абласцей Расійскай Федэрацыі. Восенню гэтага года мяркуецца таксама падпісаць пагадненне «Аб мужнасці і гераізме народаў — дзяржаў-удзельніц СНД у гады Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гг.». Гэтае пагадненне неабходнае для збліжэння пазіцый краін СНД у вядзенні мемарыяльнай працы. Падобныя пагадненні заключаны паміж краінамі далёкага замежжа і былымі савецкімі рэспублікамі, але не заключаны паміж самімі дзяржавамі, якія ўваходзілі ў склад СССР.

— Пытанні, якія тычацца, напрыклад, наведвання магіл сваякоў, якія загінулі падчас ВАВ у краінах СНД, вырашаюцца практычна на асабістых кантактах. Таму неабходна, каб у гэтай сферы была створана нарматыўная база, — перакананы Віктар Шумскі.

Неўзабаве адбудзецца і ўзнагароджанне людзей, якія актыўна праявілі сябе ў выяўленні лёсаў загінулых у час ВАВ і тых, хто працуе ў галіне палявых пошукаў. Адмыслова для гэтага 13 снежня 2010 года загадам міністра абароны Беларусі быў заснаваны нагрудны знак «За актыўны пошук». Цікава, што гэтым знакам сёлета будуць адзначаныя простыя грамадзяне, якім не абыякавыя сучасныя праблемы даўняй вайны.

Віктар Шумскі таксама распавёў, што плануецца стварэнне аўтаматызаванага банка звестак «Кніга памяці Рэспублікі Беларусь». А ў перспектыве — стварэнне электроннай базы звестак па партызанскім руху, аналагічнай базе па спаленых падчас Вялікай Айчыннай вайны беларускіх вёсках. Там будзе адлюстравана не толькі статыстыка, але і лічбавыя фотакопіі архіўных дакументаў, звязаных з гэтым этапам ваеннай гісторыі.

Жыццялюбы

# «УСЁ ДОБРАЕ Ў МЯНЕ АД МАМЫ»

**Расійскі журналіст, доктар гістарычных навук, прафесар, аўтар дванаццаці гістарычных кніг за сваё жыццё аб'ездзіў больш як 70 (!) краін свету. Але маленькая Беларусь па-ранейшаму займае асаблівае месца ў яго сэрцы. «Я нават пашпарт замежны выкінуў, — кажа Аляксандр Вікенцьевіч. — Вырашыў: калі куды і ехаць, дык толькі на радзіму!»**



Аляксандр Чарняк — выхадзец з беларускай вёскі Галынка, што за 25 кіламетраў ад Баранавіч. Зараз жыве ў Маскве і займае пасаду намесніка галоўнага рэдактара часопіса «Российская Федерация Сегодня». З вялікай ахвотай на старонках парламенцкага выдання Аляксандр Вікенцьевіч піша пра сваю радзіму, дакладней, пра беларуска-расійскія ўзаемаадносіны. Побач з гэтымі публікацыямі замест фотаздымка аўтара — выява бусла над гняздом.

— Чаму менавіта бусел? — пацікавілася я ў журналіста.

— Бусел — сімвал Беларусі. Самая грацыёзная птушка, міралюбівая і працавітая. Мне здаецца, яна перадае сутнасць самога беларуса.

— Аляксандр Вікенцьевіч, вы з такой цеплынёй гаворыце пра Беларусь. Няўжо ніколі не ўзнікала думка вярнуцца жыць на радзіму?

— І зараз узнікае... Асабліва па вечарах, калі прыязджаю з працы дадому, такі сум апаноўвае. Усё там быццам бы ёсць, толькі вось беларускага духу ў доме не хапае... Але, сама ж разумееш, адна справа па маладосці пераязджаць з месца на месца, іншая — цяпер... У мяне ж у Маскве дзеці, унукі.

Аляксандр Чарняк, хоць і жыве ў Расіі, на Беларусь не забываецца. Як мінімум тры-чатыры разы на год наведваецца сюды. І кнігу пра беларусаў, а дакладней, пра ўзаемаадносіны беларусаў, расіян і ўкраінцаў піша. Пад умоўнай назвай «Шлюбныя вузы». Дарэчы, ідэя напісаць гэтую кнігу прыйшла падчас паездкі ў Полацк.

— У гэтым горадзе свята шануюць Еўфрасіннню Полацкую — прапрапраўнучку Рагнеды. А вось пра саму княжну, заўважыў, тут гавораць мала. І дарэмна, бо ўсе мы — і беларусы, і расіяне, і ўкраінцы — маем дачыненне да Рагнеды, якая пабралася шлюбам са святым Уладзімірам. Іх дзеці пасля сталі: Ізяслаў — князем Полацкім, Яраслаў Мудры — Кіеўскім, Усевалад узначаліў Валынскае княства, Мсціслаў — Цьмутараканскае. Больш за тое, як высветлілася, амаль ва ўсіх рускіх вялікіх князёў жонкі былі беларускамі. Напрыклад, у Аляксандра Неўскага жонка была родам з Беларусі. У жонкі Пятра І Скаўронскай (Кацярыны І) бацькі — збяднелыя шляхцічы з Магілёўскай вобласці. Алена Глінская, якая была рэгентшай маладога царэвіча і ўвяла капейку, якой мы ў Расіі карыстаемся і дагэтуль, таксама беларуска. Іван Грозны наогул напалову беларус...

Аляксандр Чарняк прызнаўся, што ён, як беларус і гісторык, лічыць сваім святым абавязкам дапамагчы калегам ачысціць гістарычныя падзеі ад ідэалагічнага шалупіння. Каб людзі, у першую чаргу палітыкі, якіх надзялілі паўнамоцтвамі прымаць лёсавызначальныя рашэнні, мелі магчымасць пазнаёміцца з сапраўднай гісторыяй. А апошнім ведаць тое, што адбывалася раней, неабходна, хоць бы для таго, каб пазбегнуць памылак сваіх папярэднікаў!

Вось толькі адзін прыклад. З гісторыі вядома, што ажно 50 тысяч беларусаў (у тым ліку цэлы полк князя Радзівіл) у 1812 годзе ў складзе Напалеонаўскай арміі пайшлі супраць Расіі. Як такое можа быць? Брацкія ж народы...

— Шчыра прызнацца, калі я ўпершыню пачуў гэту лічбу, то не паверыў. Пачаў высвятляць прычыны — і ўсе пытанні адпалі самі сабой. Калі Беларусь адышла да Расіі пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай, расійскія палітыкі пачалі ўразаць беларускую шляхту ў правах, адчыняць рускія школы, прызываць у армію маладых беларускіх хлопцаў ажно на 25 гадоў. Уявіце, забраць хлопца з дому — магчыма, адзінага кармільца сям'і — на такі працяглы тэрмін!..

Пра княгіню Вольгу, Рагнеду з Ізяславам ды князёў Радзівілаў Аляксандр Вікенцьевіч можа гаварыць бясконца. Калі ж прашу падзяліцца асабістай гісторыяй, ненадоўга задумваецца...

— Ведаеш, па жыцці мне шанцуе на добрых людзей!.. Менавіта яны зрабілі з мяне, вясковага шалапута, чалавека. Іх жыццёвыя ўрокі я сёння стараюся перадаць сваім дзецям і ўнукам.

* * *

Нарадзіўся Аляксандр Вікенцьевіч у звычайнай беларускай сям'і. Мама працавала ў калгасе, тата — на спіртзаводзе.

— Бацька час ад часу прыносіў дадому спірт, — узгадвае Аляксандр Чарняк. — Вось аднойчы старэйшыя хлопцы падбухторылі мяне: вазьмі, Сашка, у бацькі бутэльку, хоць паспытаем, што гэта такое. Наспыталіся так, што пасля нас суткі адпойвалі малаком. Бацька мяне, памятаю, тады яшчэ і адлупцаваў. Ды так, што месца жывога не было. Карацей, гэты ўрок я запомніў на ўсё жыццё. Гадоў да 30 наогул не пераносіў алкаголю.

* * *

У школьныя гады любоў да літаратуры, гісторыі, сваёй зямлі, радзімы Аляксандру Вікенцьевічу прывіваў класны кіраўнік Даніла Пятровіч Шамелін, рускі чалавек з Кемерава. Ён ваяваў на возеры Ханка ў Фінскую кампанію, Вялікую Айчынную вайну прайшоў ад першага дня і практычна да апошняга. Незадоўга да перамогі настаўніка датэрмінова дэмабілізавалі і адправілі ў вызваленую Беларусь. Тут ён ажаніўся з беларускай дзяўчынай.

— У Данілы Пятровіча быў толькі адзін касцюм, — распавядае спадар Чарняк. — Аднойчы жонка памыла яго, і дырэктару школы нічога не заставалася, як апрануць шынель на спадніюю бялізну. І што вы думаеце, у гэты дзень, як на зло, у школу прыехала праверка. Тое, што Даніла Пятровіч суправаджаў кіраўніцтва ў верхняй вопратцы, было расцэнена як непавага. У выніку майго любімага настаўніка знялі з пасады дырэктара.

* * *

На жыццёвым шляху Аляксандра Вікенцьевіча чакала шмат перашкод. На журфак БДУ выпускніка школы не прынялі, бо, згодна з пастановай ЦК, каб стаць журфакаўцам, трэба было мець як мінімум два гады вытворчага стажу. На завод у Баранавічах у тыя часы ўладкавацца таксама было практычна нерэальна.

— Калі б не дабрыня сакратара па прамысловасці гаркама партыі Мікалая Сямёнавіча Спондара, не ведаю, як склалася б маё жыццё. Як зараз памятаю, заходжу ў кабінет, прашуся на завод, а ён у адказ: «Ведаеце, у мяне такіх, як вы, сваіх выпускнікоў школ больш за тысячу, не ведаю, куды іх падзець. Раз вы з вёскі, дык ідзіце працаваць у калгас».

Аляксандр не разгубіўся і пачаў даставаць з папачкі свае заметкі, граматы, рэкамендацыю з нясвіжскай раённай газеты.

— Мікалай Сямёнавіч паглядзеў на мяне ўважліва, моўчкі набраў нумар тэлефона і прамовіў: «Слухай, у мяне тут хлопец добры ў кабінеце стаіць, прымі яго на работу». Так я стаў вучнем токара на заводзе станкапрылад. Удзень працаваў, а ноччу пісаў артыкулы.

У хуткім часе прага да журналістыкі прывяла маладога чалавека ў Дзівінскую раёнку, што на Брэстчыне. Крыху папрацаваў — і трапіў пад скарачэнне.

— Што мне было рабіць? Назад на завод ніхто не прыме. Вяртацца ў родную вёску сорамна, там жа ўсе адзін аднаго ведаюць. Тады ў мяне нарадзілася думка паглядзець Савецкі Саюз. Выкупаўся ў Бугу і паставіў сабе мэту зрабіць тое ж самае, але ўжо ў Ціхім акіяне. І што вы думаеце: абяцанне, дадзенае сабе, я выканаў — Ціхі акіян прыняў мяне ў свае воды ў дзень, калі паляцеў у космас Юрый Гагарын.

* * *

Служыў Аляксандр Вікенцьевіч спачатку ў ракетнай часці ў далёкай Забайкальскай Даўр'і, а потым пад Пінскам. Менавіта там і сустрэў самага галоўнага чалавека ў сваім жыцці. Упершыню Ларысу ўбачыў падчас звальнення на пляцоўцы ў Матроскім парку на танцах.

— Набраўся смеласці і запрасіў на танец. Яна ў туфліках была лакіраваных, якія я ў той вечар паабдзіраў сваімі нязграбнымі кірзавымі ботамі. Як высветлілася, Ларыса была старэйшая за мяне на 6 гадоў, працавала намеснікам рэдактара «Пінскай праўды». Праз месяц мы распісаліся. У ЗАГСе жанчына, якая афармляла дакументы, сказала нявесце: «Дзяўчына, што ж ты робіш, я ж вас распісваю на нейкім салдацкім білеце, ён жа заўтра выкіне яго. А ты куды пойдзеш?» 43 гады мы прайшлі рука аб руку ў каханні і згодзе. Тое, чаго я дабіўся ў жыцці, — гэта заслуга жонкі.

* * *

Калі Аляксандр Чарняк прыязджае ў Беларусь, па магчымасці, стараецца заехаць у родную вёску, каб прайсціся роднымі сцяжынкамі, пасядзець на лаўцы ля бацькоўскай хаты, у думках паразмаўляць з мамай...

— Мама непісьменная была. Крыжыкам распісвалася. Але такога добрага чалавека яшчэ пашукаць трэба. Яна за ўсё сваё жыццё нікога не пакрыўдзіла, усім старалася дапамагчы. І мне заўсёды казала: «Сынок, будзь дабрэйшым да людзей. Чым можаш, дапамажы. Не азірайся на тое, што нешта згубіш сваёй дапамогай. Сёння згубіш, заўтра знойдзеш».

**Надзея ДРЫЛА, фота аўтара.**

### Вытрымкі з публікацый Аляксандра Чарняка пра Беларусь:

- «... «газовые», «сахарные», «молочные» и прочие конфликты между двумя членами Союзного государства вносят сумятицу в умы россиян и белорусов — теряется вера в то, что будет единая крепкая семья, то бишь Союзное государство. Теряется вера в политиков, способных создать его. Огромная Россия, конечно, спокойно проживет без Беларуси. Не погибнет, естественно, и Беларусь. Живут же и процветают небольшие государства — Чехия, Словакия, Люксембург, африканские, азиатские, латиноамериканские... Но разве это пойдет на пользу братским народам? Думаю, что нет. Не пошло же простым людям из бывших союзных республик то, что развалился Советский Союз. В этом были заинтересованы и обогатились лишь иные политики и их окружение» («РФ сегодня», «В НЕФТЯНОМ СПОРЕ ПОСТАВЛЕНА ТОЧКА?»).
- «И в нынешние непростые времена Беларусь развивается более динамично, чем другие страны СНГ. Правда, с подачи предводителя мальчишек в розовых штанишках Егора Гайдара либералы и подвластные им СМИ стали бубнить, что Беларусь процветает за счет России, получая энергоресурсы по низким ценам. Да, газ и нефть старшая сестра поставляет младшей, с которой строит общий дом, то бишь Союзное государство, в коем уже технологической цепочкой задействовано около 25 млн человек, по ценам чуть-чуть ниже мировых, но никогда Беларусь не была нахлебницей. И потом, она поставляет в Россию качественное дешевое продовольствие, экономя простым людям деньги. Россия же то и дело перекрывает газовый и нефтяной вентили...

...Как это ни парадоксально, но силовое давление старшей сестры на младшую идет последней на пользу. Белорусы, как говорится, стоят на ушах, чтобы выжить, ищут и находят пути и способы улучшения работы...

*(«РФ сегодня», «ОРИЕНТИР БЕЛАРУСИ — ВЫСОКИЕ ТЕХНОЛОГИИ»).*

# Пішы ў Вікіпедыю па-беларуску!

**Беларускі раздзел Вікіпедыі, альбо Свабоднай энцыклапедыі www.be.wikipedia.org папоўніўся 30-тысячным артыкулам. Ім стаў артыкул пра сталіцу Бургундыі — французскі горад Джыён — паведамляе Васіль Кісляк, даглядальнік беларускай Вікіпедыі.**

Наогул, на працягу апошняга года колькасць артыкулаў беларускага раздзела Вікіпедыі вырасла на 50%. Цікава, што значнае павелічэнне якасці і колькасці беларускамоўнага «кантэнту» адбылося дзякуючы настойлівым і сістэматычным намаганням групы рэдактараў і аўтараў Вікіпедыі, якія пішуць на роднай мове. Усяго іх налічваецца каля 170 чалавек, і ўсе яны працуюць на добраахвотнай аснове сабе ў задавальненне. Кожны беларус, які добра валодае камп'ютарам, можа далучыцца да ліку аўтараў беларускай Вікіпедыі, бо гэта адкрыты праект. Такая дабрачынная высакародная праца, дарэчы, дапамагае развівацца і беларускай мове, і беларускамоўным. Вікіпедыя — адзін з самых папулярных, запатрабаваных некамерцыйных інтэрнэт-праектаў у свеце. Шмат карыстальнікаў з усіх кантынентаў ахвяруе грошы на падтрымку Вікіпедыі, каб яна не змяшчала рэкламы і ўвесь запас чалавечых ведаў як мага хутчэй перакладаўся на ўсе мовы свету. Ужо адно тое, што там ёсць інфармацыйныя артыкулы па-беларуску — вельмі станоўчы момант.

Яшчэ адметна, што нядаўна беларускамоўная інтэрнэт-энцыклапедыя ўзнялася на 1-е месца сярод 280 іншых Вікіпедый свету па крытэрыі звязанасці. Гэта значыць, злучанасці розных матэрыялаў энцыклапедыі паміж сабой. Напрыклад, калі вы чытаеце артыкул беларускай Вікіпедыі пра зубра, то адзін раз «клікнуўшы» па гіперспасылках у гэтым артыкуле, вы можаце прачытаць інфармацыю і пра Белавежскую пушчу, і пра «Песню пра зубра» Міколы Гусоўскага, і пра бізонаў, буйвалаў, муфлонаў і іншых звяроў.

Сёння кожны беларус можа ганарыцца тым, што беларускамоўная прастора ў звышпапулярнай Вікіпедыі вылучаецца сярод іншых сваёй добра адпрацаванай сістэмай навігацыі, размеркаванасцю артыкулаў па асобных тэмах, выдатнай структурай. У беларускамоўным раздзеле амаль не засталося ізаляваных артыкулаў, хаця год таму іх было больш за 7 тысяч!

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**

# У канкурэнтнай барацьбе самы галоўны аргумент — ЯКАСНЫ ПРАДУКТ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Аднак асноўная тэма ў дзейнасці «Барысаўпраекта», вядома ж, датычыць узвядзення жылля. Як падкрэсліваў кіраўнік інстытута Віктар Феакціставў, гэтага патрабуе само жыццё, патрабуе аблвыканкам: «Жыллё, жыллё і яшчэ раз жыллё...». Найбольш маштабная забудоўля непасрэдна ў самім Барысаве вядзецца цяпер у яго мікрараёне № 6, што мяжуе са знакамітым барысаўскім ваенным палігонам. Прычым літаральна побач, праз генеральскую дарогу (так называюць тут шашу вакол горада) стаялі сярод кустоў, падчас нашага наведвання гэтага мікрараёна, ваенныя БТРы...

Новы мікрараён забудоўваецца пераважна 9-павярховымі дамамі. Гэтыя дамы ўтвараюць прыгожыя замкнутыя ансамблі з адгароджанымі такім чынам унутрыдваровымі астраўкамі, з абмежаваннем на іх руху транспарту. Увогуле, звяртае на сябе ўвагу абуладкаванне інжынерна-транспартнай структуры мікрараёна — з шырокімі пад'язнымі пуцямі, з прасторнымі пляцоўкамі для паркоўкі аўтамабіляў...

— У поўнай меры ўлічваем сучасныя тэндэнцыі і патрабаванні ў сучасным горадабудаўніцтве, — падкрэсліваў галоўны інжынер «Барысаўпраекта» Аляксандр Місіюк. — А колькасць парковак плануецца такой, каб месца хапіла ўсім. Прычым у гэтым новым мікрараёне прадугледжана ўзвядзенне і падземных паркавак. Праўда, яшчэ не вырашаны пытанні з іх фінансаваннем, з інвестарамі, але плошчы для такіх паркавак адведзены.

Новы мікраараён, над праектаваннем якога ў першую чаргу і працуюць у «Барысаўпраекце», разлічаны недзе на 13 тысяч жыхароў. Гэта пакуль што. Бо і праектанты, і ўлады горада ўсё больш настойліва паглядваюць за тую ж генеральскую дарогу: там добрая прастора для далейшага разгортвання жыллёвага будаўніцтва ў горадзе. Але, як ужо зразумела, не пускаюць ваенныя. А між тым, напэўна, варта ўлічваць, што не такое ўжо і добрае для горада гэта суседства. Палігоны, як вядома, прызначаныя для вучэнняў, а на апошніх, як таксама добра вядома, часам і страляюць... Аднак, як казалі ў «Барысаўпраекце», не трэба думаць пра горшае. Няхай будзе так. Аднак пры гэтым не варта забывацца і пра той пыл, якога, безумоўна, абавязкова напусціць на новы мікраён (а можа, ужо напускае) тая ж баявая тэхніка з-пад сваіх колаў і тракаў. Адным словам, відавочна нелагічнае суседства. І ці быць яму і надалей, у многім залежыць ад адпаведнай пазіцыі Міністэрства абароны краіны, якому не пашкодзіла б пашукаць больш «ціхае» месца для ваенных «гульняў».

* * *

Наведваць падатковую інспекцыю ды яшчэ мець пэўныя зносіны з яе супрацоўнікамі нашы грамадзяне, як добра вядома, не вельмі любяць. А вось мы наведалі, і нас вельмі добра там сустрэлі. Вядома, наведалі барысаўскую інспекцыю. І, напэўна, таксама зразумела, наведалі яе як аб'ект, запраектаваны «нашым» жа інстытутам. Прычым ацанілі ў поўнай меры не толькі творчыя схільнасці, арыгінальнасць творчага бачання барысаўскіх праекціроўшчыкаў, але і іх уменне працаваць з заказчыкам, наладжваць з ім сапраўдныя партнёрскія адносіны. А пры распрацоўцы гэтага праекта былі ўлічаны, па сутнасці, выключна ўсе пажаданні заказчыка, нават тое, каб на каньку даху быў запраектаваны металічны каваны флюгер. Пры гэтым у інспекцыі папрасілі: аб'ект павінен атрымацца прыгожым і танным (усё ж такі інспекцыя, а не банк, і ёй неяк не з рукі раскідвацца сродкамі). Так і атрымалася: і прыгожа (нават стандартная прамавугольная «цагліна» былога дзіцячага садка, адышоўшага пад інспекцыю, не выглядала зусім прымітыўна ў спалучэнні са зробленай да яе арыгінальнай прыбудовай), і танна. А яшчэ вельмі ўтульна — як непасрэдна ў самім будынку, так і на тэрыторыі вакол інспекцыі, на якой ёсць і фантаны, і невялічкі вадаём, і альтанкі, і амаль сапраўдны батанічны сад.

— Уся гэта прыгажосць на тэрыторыі інспекцыі створана ўжо непасрэдна самім заказчыкам, рукамі супрацоўнікаў інспекцыі, прычым ужо амаль адразу ж пасля ўводу аб'екта... Прыемна, калі тварэнні нашых праектантаў дапаўняюцца з боку заказчыка такім вось чынам, — падкрэсліваў галоўны інжынер «Барысаўпраекта» Аляксандр Місіюк. Варта дадаць: уся гэтая створаная прыгажосць неаднойчы адзначалася на спецыялізаваных рэспубліканскіх конкурсах, падчас якіх калектыў інспекцыі неаднаразова выходзіў пераможцам.

Адным словам, калі хто, можа, і не зусім сябруе з барысаўскай падатковай інспекцыяй і атрымае ад яе пэўнае прадпісанне, ён ужо тут жа, на яе прыгожай тэрыторыі, можа атрымаць паўнейшую рэлаксацыю. Вядома, гэта гучыць хутчэй як жарт. А вось начальнік барысаўскай падатковай інспекцыі Мікалай Крыжаноўскі вельмі сур'ёзна ставіцца да гэтага пытання: «Нашага падаткаплацельшчыка яшчэ трэба выхоўваць. Павінна быць так, як на Захадзе: заплаціў падаткі ў поўным аб'ёме і своечасова — значыць, ты самы паважаны чалавек». На гэтым закліку да падаткаплацельшчыкаў і пакінем барысаўскіх падаткавікоў.



Новы барысаўскі стадыён, які ўзводзіцца цяпер, стане адным з буйнейшых у краіне. На яго будаўнічай пляцоўцы фотааб'ектыў «убачыў» галоўнага інжынера КУП «Інстытут «Барысаўпраект» Аляксандра МІСІЮКА і начальніка ўчастка БУ-157 Генадзя ПЯТКЕВІЧА.




Над трыбунамі стадыёна, дзе выступае вядомая каманда футбольнага клуба БАТЭ, па праекце КУП «Інстытут «Барысаўпраект» зроблены прыгожы казырок.

**ДЛЯ ДАВЕДКІ.** Інстытут «Барысаўпраект» распрацоўвае дакументацыю на ўзвядзенне аб'ектаў І і ІІ узроўняў адказнасці (удакладнім: з нядаўняга часу адпаведнае ліцэнзаванне, па ўзроўнях адказнасці, адменена, і чакаецца нейкая іншая працэдура, якая б сведчыла аб узроўні прафесіяналізму праектных і будаўнічых арганізацый), а таксама праводзіць інжынерныя пошукі для гэтых мэт. Інстытут ажыццяўляе распрацоўку генеральных планаў, архітэктурных і будаўнічых рашэнняў аб'ектаў, іх інжынернага абсталявання, арганізацыі будаўніцтва (у тым ліку з выкананнем функцыі генеральнага праекціроўшчыка) для ўзвядзення:

- жыллёвых, грамадскіх, вытворчых і сельскагаспадарчых будынкаў і комплексаў;
- знешніх цеплавых, водаправодных і каналізацыйных сетак;
- ліній электраперадач, сувязі, радыё і тэлебачання;
- вуліц і дарог.

Для якаснай распрацоўкі і выпуску праектнай прадукцыі прадпрыемства забяспечана высокатэхналагічным абсталяваннем. Праектна-каштарысная дакументацыя распрацоўваецца на аўтаматызаваных працоўных месцах.

Інстытут «Барысаўпраект» мае поўны комплекс тэхнічных нарматыўных актаў у галіне архітэктуры і будаўніцтва, якія рэгламентуюць яго праектную дзейнасць, комплекс неабходных даведачных і інфармацыйных матэрыялаў для праектавання. Дакументацыя размешчана як на папяровых, так і на электронных носьбітах у выглядзе інфармацыйна-пошукавых сістэм.

На рынку праектных паслуг інстытут характарызуецца як прадпрыемства, здольнае распрацоўваць і пастаўляць спажыўцу праектную прадукцыю высокай якасці і ў вызначаны тэрмін. Стратэгічным кірункам дзейнасці інстытута на сучасным этапе з'яўляецца захаванне і ўмацоўванне даверу спажыўца. У 2005 годзе сістэма менеджменту якасці прадпрыемства атэставана па стандартах ІСО 9001, і кожны год пацвярджаецца яе дзейснасць.



Будынак «Белзнешэканамбанка» ўпрыгожвае барысаўскую вуліцу Гагарына.



Вуліца Каліноўскага ў Жодзіне — тут выраслі новыя жылыя будынкі па праектах КУП «Інстытут «Барысаўпраект».

* * *

І вернемся да нашай непасрэднай тэмы. А ў прыватнасці, перададзім нашу гутарку з дырэктарам інстытута «Барысаўпраект» Віктарам Феакціставым. Тут жа прадставім яго.

Віктар Феакціставў працуе ў будоўлі з 1973 года. Быў майстрам, начальнікам аддзела ў апараце 21-га будаўнічага трэста, працаваў галоўным інжынерам Барысаўскага завода буйнапанэльнага домабудавання і ўжо больш за 20 гадоў узначальвае інстытут «Барысаўпраект». Мае дзве вышэйшыя адукацыі — будаўнічую і эканамічную.

Як расказаў Віктар Феакціставў, інстытут створаны на пачатку 1946 года, і, як ужо, напэўна, зразумела, яго стварэнне выклікана неабходнасцю як мага хутчэйшага пасляваеннага аднаўлення. У розны час ён меў рознае падпарадкаванне, а ў канцы 1995 года атрымаў поўную самастойнасць. Найбольш актыўнае развіццё атрымаў за апошнія 8—10 гадоў. Так, калі ў 2005 годзе тут мелі ў сваім складзе каля 70 чалавек, то цяпер — больш за 190; у аб'ёмах за гэты час прыраслі недзе ў 10 разоў. Увогуле, апошнім часам тут штогод маюць 125—130 працэнтаў росту, сёлета плюсуюць да леташняга адпаведнага перыяду ў межах 31 працэнта.

Інстытут мае важкі партфель заказаў, пры гэтым на 70 аб'ектаў ён ужо атрымаў авансы — «трэба іх адпрацоўваць».

Што яшчэ найбольш цікавага ў праектах інстытута, акрамя таго, што мы пабачылі? Гэта праект рэканструкцыі цэнтральнай вуліцы Барысава — Гагарына, якая праляглa праз увесь горад (ранейшая асноўная траса на Маскву); праектная распрацоўка новага моста цераз Бярэзіну (цяперашні, з трыма палосамі руху, відавочна не спраўляецца з патокамі транспарту — плануецца мост з 6 палосамі); кіраўнік інстытута таксама вельмі цікавай работай назваў распрацоўку сумесна з інстытутам «Белгіправодгас», на якім, як на спецыялізаванай арганізацыі, ляжыць асноўная частка ўсёй работы — інжынернай абароны горада ад падтапленняў. У прыватнасці, у такой абароне маюць патрэбу мікраараёны «Дымкі», «Максімаўка», раён вуліцы Нармандыя—Нёман.



Барысаўская падатковая інспекцыя размешчана ў будынку, які ўзведзены па праекце інстытута.



Начальнік аддзела інфармацыі і менеджменту якасці Марына РАШЭТНІК і інжынер Святлана БАБРОЎСКАЯ.

**— Віктар Дзмітрыевіч, а не паўплывае на вашы планы цяперашняя ўстаноўка на некаторае скарачэнне аб'ёмаў будаўніцтва, і ў прыватнасці — за кошт бюджэтных сродкаў?**

— Пра горшае стараюся не думаць. Для нас, напрыклад, вельмі цяжкім быў 1992 год, калі ўсе нашы заказы на пальцах можна было палічыць — усяго 5. Нічога, выжылі. Думаю, і цяпер у выпадку чаго знойдзем работу.

**— У той час многія будаўнікі рушылі ў Расію, там знаходзілі сабе работу...**

— Тады і мы бралі расійскія заказы. А потым нямала стала работы тут, было не да паездак. Але калі будзе такая патрэбнасць, зноў звернемся да расійскага будаўнічага рынку, тым больш — у горада Барысава ёсць у Расіі пабрацімы — гарады Малаяраславец, Нагінск, Падольск.

**— Віктар Дзмітрыевіч, у вашай справе, безумоўна, патрэбны высокі прафесіяналізм людзей. Што вы скажаце на гэта?**

— Высокі прафесіяналізм патрэбен у любой справе, але ў нашай, безумоўна, — асабліва. Мы ў свой час, калі ў нас былі невялікія аб'ёмы, не пайшлі на скарачэнне людзей. І выйгралі потым, пазней, пры павелічэнні аб'ёмаў. У нас, напрыклад, ёсць спецыялісты, якія працуюць па 40 гадоў. Безумоўна, вопыт іх — неацэнны. А разам з тым, прыходзяць маладыя, якія маюць іншы неблагі вопыт — вопыт камп'ютарнага праектавання. У выніку атрымліваецца гэткі добры сплаў. Добры штуршок прыходу ў арганізацыю новых людзей дало будаўніцтва намі свайго кааператыўнага 40-кватэрнага дома. Цяпер чаргі на жыллё ў нас практычна няма, тым жа, хто набывае кватэры самастойна, дапамагаем, даем беспрацэнтныя пазыкі.

**— Хто важнейшы ў праектнай рабоце: архітэктар ці канструктар? Ці ёсць у іх супярэчнасці пры праектаванні аб'ектаў?**

— Паміж архітэктарам і канструктарам павінен быць гэткі добры сімбіёз. Увогуле, калі чалавек мае архітэктурны густ, ды плюс да таго веды інжынера, гэта проста цудоўна, з яго будзе незаменны спецыяліст. Я нават раю тым, хто мае адукацыю архітэктара, заканчваць таксама факультэт прамыслова-грамадзянскага будаўніцтва. А наконт супярэчнасцяў пры праектаванні якога аб'екта — іх хапае з лішкам, часам разгортваюцца такія спрэчкі... Архітэктар спрачаецца з канструктарам, каб у поўнай меры былі ўлічаны яго архітэктурныя думкі, сантэхнікі прад'яўляюць свае прэтэнзіі: маўляў, вы тут панамалявалі, а дзе месца, каб мне свае трубы пракласці, электрыкі шукаюць у гэтым праекце свае нестыкоўкі... Збіраем у такіх выпадках архітэктурны савет і ў канчатковым выніку знаходзім ўзаемаўзгодненае рашэнне. Карацей кажучы, такія спрэчкі нават на карысць.

**— Існуе меркаванне, што праекціроўшчыкі, так бы мовіць, знімаюць добрыя пенкі з агульнага кошту аб'ектаў, якія ўзводзяцца?**

— Ведаем пра гэта меркаванне. Прычым дапускаем, што, можа, нехта недзе і хуліганіць. Але нас у гэтых адносінах папракнуць ніяк нельга. У нас ёсць спецыяльныя каталогі, у якіх абсалютна ўсё расцэнена, і ад іх — ніякіх адступленняў. А калі трэба — прымяняем паніжаючыя каэфіцыенты. Нашы дагаворы правяраюцца дзяржаўнай экспертызай, прычым нязначныя сумненні ў трактоўках гэтых дагавораў вырашаюцца на карысць заказчыка. Нас правяраў Дзяржкантроль — істотных заўваг няма. Хоць пры ўсім гэтым дробязныя выпадковыя памылкі пры складанні каштарысаў бываюць. У нас працуюць 5 эканамістаў, і яны за ўсім гэтым сочаць вельмі строга. І за ўсё гэта — сур'ёзна адказваюць. А калі мець на ўвазе цану нашых праектаў у агульным кошце будаўніцтва (напрыклад, жылых дамоў), яна, як правіла, складае 3—4,5 працэнта. Звычайная для праекціроўшчыкаў доля.

* * *

<u>**Асобныя паказчыкі дзейнасці інстытута.**</u> Летась у ім выканана праектных работ на суму 8 мільярдаў 214 мільёнаў рублёў уласнымі сіламі, чыстага прыбытку атрымалі тут 692 мільёны; прадукцыйнасць працы павысілі на 19 працэнтаў; рэнтабельнасць склала 15,8 працэнта. Прыкладна такую дынаміку ў сваёй дзейнасці маюць у інстытуце і сёлета.

Як зазначана ўжо, інстытут у асноўным праектуе жыллё, прычым выключна для вобласці. Апошнім часам каля 20 працэнтаў усяго жылля для яе праектуецца менавіта ў барысаўскім інстытуце. Так, калі ў вобласці штогод узводзіцца крыху больш за мільён квадратных метраў, з іх 160—180 мільёнаў метраў праектуецца менавіта ў інстытуце «Барысаўпраект».

* * *

Падчас нашай экскурсіі са спецыялістамі інстытута па аб'ектах, запраектаваных у іх калектыве, яны звярнулі ўвагу на наступную акалічнасць. Часам бывае так: праект выкананы — ды й адкладзены на далёкую паліцу. І невядома, пачнуць па ім будаўніцтва ці не. Пры гэтым не заўсёды і грошай за зробленую працу можна дачакацца. Гэта, напрыклад, датычыць праекта рэканструкцыі аўтавакзала ў Барысаве, якому ўжо даўно належыць надаць сучасны выгляд.



Праект касцёла, які пабудаваны на ўскраіне Жодзіна, таксама зрабілі спецыялісты КУП «Інстытут «Барысаўпраект».

Дарэчы, грошы за гэту працу ў інстытуце атрымалі. «Але ж справа нават не ў грошах, — падкрэслівалі спецыялісты. — Зроблены ж, на наш погляд, вельмі неблагі праект, чаму ж яго адразу не рухаюць у жыццё? Няма грошай на будаўніцтва — навошта было заказваць гэты праект? Між тым, вакзал — гэта твар горада. Крыўдна».

Крыўдна спецыялістам і за зробленыя праекты па Жодзінскай гімназіі («Там вялікі аб'ект быў — два карпусы былога дзіцячага садка аб'ядноўваліся вялізнай прыбудовай. Праект зроблены ўжо даўно, а аб'ект тым часам разбураецца»), пакуль што пакрываецца пылам і праект па рэканструкцыі аднаго з карпусоў жодзінскай бальніцы...

Крыўда праектантаў — цалкам зразумелая. Безумоўна, намнога больш прыемна ўбачыць свой праект цалкам увасоблены ў жыццё. Як, напрыклад, прыгожа рэканструяваныя плошчы ў Барысаве — у новым і ў старым горадзе (у старым — са змешчаным перад саборам помнікам князю Барысу — заснавальніку горада), як велічны будынак касцёла ў Жодзіне і іншыя аб'екты... Увогуле, у інстытуце «Барысаўпраект», калі кажуць пра сучасныя тэндэнцыі ў праектаванні і будаўніцтве, падкрэсліваюць: «Канкурэнцыя ў гэтых галінах, якая існуе цяпер, будзе абвастрацца. А ў канкурэнтнай барацьбе самы галоўны аргумент — якасны прадукт».

* * *

Вы яшчэ не пабывалі ў цэнтры экалагічнага турызму «Станькава», заснавальнікамі якога з'яўляюцца агракамбінат «Дзяржынскі» і музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны? Варта наведаць, даволі цікавае месца. І, няйначай, найбольш спадабаецца гэта экскурсія вашым дзецям. А праект амаль поўнасцю падрыхтавала група праектантаў з Мінскага аддзялення (у групе 7 чалавек) інстытута «Барысаўпраект», якую ўзначальвае яшчэ зусім малады, хоць яму «ўжо споўнілася 26 гадоў», Дзмітрый Кудраўцаў. Гэты цэнтр аб'ядноўвае тры комплексы. Першы — дзіцячы: са страусамі, фазанамі, поні і іншымі асобінамі жывёльнага свету, якія нават свае невялічкія домікі маюць тут (а яшчэ быў зафіксаваны бадзёры покліч пеўня. Як патлумачыў Дзмітрый Кудраўцаў, і для хатняй птушкі знайшлося тут месца). А яшчэ дзяцей чакаюць водныя прагулкі на розных плавальных сродках па шырокай паверхні вялізнага надзіманага басейна і іншыя забавы, ды яшчэ смачныя стравы ў кавярні «Мішутка». «І назва — таксама наша», — з гонарам зазначаў Дзмітрый Кудраўцаў, якому, нагадаем, ужо столькі шмат гадоў. Зразумела ўжо, што і адпаведны праект зроблены яго мінскай групай.

Аднак прадоўжым нашу экскурсію. Другі комплекс уключае ў сябе створаную пагранічную мяжу з казармай, бліндажом (сапраўдным), паравозамі і баявой тэхнікай, а таксама з гасцявымі домікамі, якія можна заняць на колькі хочаш дзён, ды яшчэ з рэстаранам. Зразумела, усё гэта ўжо для дарослых.

А ў трэці комплекс уваходзяць партызанскія зямлянкі. Мы спусціліся ў адну з іх: у ёй сядзеў партызанскі камандзір і, як нам падалося, быў вельмі сумны. Адным словам, наведайце і заадно поўнасцю акуніцеся ў дух таго нялёгкага і гераічнага часу.

Ужо зазначана: гэты цэнтр праектавала, працягвае праектаваць цяпер мінская група інстытута. «Трэба яшчэ лазерны цір спраектаваць на дзіцячым комплексе, іншыя аб'екты, — казаў Дзмітрый Кудраўцаў. — Вельмі цікавая праца».

Яго група, акрамя гэтага, праектуе рэканструкцыю шэрагу вуліц у Маладзечне. Нагадаем: горад рыхтуецца да «Дажынак».

Інстытут стварыў два такія падраздзяленні — другое знаходзіцца ў Жодзіне. Іх неабходнасць, як паведамілі ў інстытуце «Барысаўпраект», тлумачыцца тым, каб «мы» бліжэй былі да месцаў, да «сваіх» асноўных аб'ектаў, якія праектуюцца.

* * *

А на заключэнне зазначым: інстытуту «Барысаўпраект» споўнілася сёлета 65 гадоў з дня яго заснавання, з чым мы і віншуем калектыў.

— Наперадзе ў нас нямала цікавай працы. Калектыў у нас высокапрафесійны, людзі працуюць добрасумленна, і, бясспрэчна, мы з усёй гэтай працай справімся годна, — падкрэсліваў падчас гутаркі дырэктар інстытута Віктар Феакціставў.

**Іван БАРАНОЎСКІ.**
**Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).**

УНП 600010465.



Кіраўнік аддзела Дзмітрый КУДРАЎЦАЎ (першы справа) з супрацоўнікамі Наталляй ЯСКЕВІЧ, Кацярынай МАЗУР, Вольгай МАРТЫНАВАЙ, Паўлам ШУБЯНКОВЫМ.



Музейная пляцоўка «Старая застава».





Цэнтр экалагічнага турызму «Станькава» Дзяржынскага раёна: аб'екты ўзведзены па распрацоўках маладога калектыву Мінскага аддзялення інстытута.

